

## ШТО АДБЫВАЛАСЯ НА РЫНКУ НЕРУХОМАСЦІ Ў 2023-М

4

## ЯК ВЫБРАЦЬ БЯСПЕЧНЫЯ ЁЛАЧНЫЯ ЦАЦКІ?

6




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

27 СНЕЖНЯ 2023 г.
СЕРАДА
№ 251 (30131)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ


### КОРАТКА

• **Тэмп росту сярэдняга заробку на 2023 год на прадпрыемствах Мінпрама чакаецца на ўзроўні 123 %.**

• Эксперт: вакцынацыя — гэта шанц, які дазваляе аблегчыць хаду грыпознай інфекцыі.

• **БУТБ будзе супрацоўнічаць з Фондам падтрымкі прадпрымальніцтва Тывы.**

• Больш за 411 тысяч жыхароў ЕС з пачатку года наведалі Беларусь па бязвізе.

• **Экспарт тавараў Віцебскай вобласці за 9 месяцаў вырас у 1,7 раза.**

# СУСТРЭЧА НЕФАРМАЛЬНАЯ, АЛЕ ВАЖНАЯ

## У другі дзень свайго візіту ў Расію Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыняў удзел у нефармальнай сустрэчы лідараў краін СНД

**Месцам правядзення мерапрыемства быў абраны Канстанцінаўскі палац у Стрэльна. Цяпер гэта дзяржаўны комплекс «Палац кангрэсаў». Адрэстаўрыраваны і аднаўлены палац у цяперашні час выкарыстоўваецца для мерапрыемстваў высокага ўзроўню, дзяржаўных прыёмаў. Але тут таксама праводзяцца экскурсіі і для ўсіх ахвотных.**

«Мы кожны раз збіраемся пад канец года ў такім цесным коле, і гэта ўжо добрая традыцыя. Падобныя сустрэчы даюць вельмі добрую магчымасць разам падвесці вынікі дзейнасці Садружнасці Незалежных Дзяржаў, пагаварыць аб планах на перспектыву і, зразумела, абмеркаваць хвалюючыя нас пытанні міжнароднага парадку дня», — сказаў у пачатку сустрэчы гаспадар нефармальнага саміту Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін.

Паводле яго слоў, адыходзячы год быў для СНД выключна актыўны і насычаны, напоўнены буйнымі мерапрыемствамі і яркімі ініцыятывамі, у чым ён бачыць і заслугу Кыргызстана ў перыяд старшынства гэтай краіны ў Садружнасці.

З новага года старшынства ў СНД пяройдзе Расіі. «Плануем у духу пераемнасці прадоўжыць шматпланавую інтэграцыйную дзейнасць», — заявіў Уладзімір Пуцін.

У Санкт-Пецярбургу ў гэты дзень кіраўнік беларускай дзяржавы правёў двухбаковую сустрэчу з Прэзідэнтам Азербайджана Ільхамам Аліевым, а таксама прыняў з дакладам пасла Беларусі ў Расіі Дзмітрыя Крутога.

***Падрабязней аб гэтых сустрэчах — на стар. 2.***



Фота БелТА.

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Вольга КУНЦОВА, начальнік упраўлення гандлю Белкаапсаюза:**

*«У сельскіх крамах па сістэме спажывецкай кааперацыі 91 працэнт — тавары айчынных вытворцаў. Можна назваць любога вытворцу ў краіне — ён будзе ў нашых крамах. У кожным рэгіёне таксама прадстаўлены мясцовыя вытворцы. Толькі 9 працэнтаў усяго асартыменту, што не вырабляецца ў Беларусі або вырабляецца ў недастатковай колькасці, прывозіцца з-за меж краіны. Гэта датычыцца рыбы свежамарожанай, асобнай садавіны, мінімуму нехарчовых тавараў».*

# У Новы год — экспрэсам





На выхадныя на Дзіцячай чыгунцы ў Мінску пачаў курсіраваць «Навагодні экспрэс». Маленькіх пасажыраў — а іх цягнік можа перавезці больш за 250 чалавек — чакаюць цікавае падарожжа і, вядома, сустрэча з галоўнымі святочнымі героямі. А кіраваць цеплавозам на першым рэйсе казачнага экспрэса даверылі дзесяцікласніку 190-й мінскай школы Святаславу СУНЮ. З абавязкамі машыніста ён спраўляецца як сапраўдны прафесіянал. Хлопец ужо чацвёрты год займаецца ў гуртку «Юны чыгуначнік» і па выніках тэстаў і экзамену паказаў выдатныя веды і ўменні.

**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

Ад прадзедаў

# ГРУШКА, ШТО ПАКІДАЕ НАДЗЕЮ

## Больш за сто гадоў мясцовыя жыхары нясуць крыжы да дрэва, пад якім, паводле легенды, вясковай дзяўчынцы з'явілася Божая Маці

**Стараста вёскі Бушмічы, яе ўраджэнка Надзея КАРПУК мае паважаны ўзрост. Надзея Іванаўна 42 гады адпрацавала ў мясцовай бібліятэцы. І ўсё жыццё наведвала, як яна кажа, Святую Грушку, збірала матэрыялы пра вясковую традыцыю. А галоўнае — дагледала, прыбірала, добраўпарадкавала разам з аднавяскоўцамі гэтае месца. Грушку адкрыта шануюць толькі апошнія тры з палавай дзесяцігоддзі. А раней шмат чаго здаралася.**

### Гісторыя вылячэнняў

Надзея Карпук расказвае, што вясковую легенду пачула ў дзяцінстве ад сваіх бацькоў і дзядоў. Але ўсе тут лічаць, што гісторыя, якая перадаецца з пакалення ў пакаленне, не легенда, а чыстая праўда. Бо было гэта не так і даўно. Яшчэ ў сярэдзіне мінулага стагоддзя многія памяталі тую дзяўчынку Параску.

СТАР. 5



ISSN 1990 — 763X

23151

## У РАБОЧЫМ ФАРМАЦЕ

**У Санкт-Пецярбургу адбылася двухбаковая сустрэча Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі і Прэзідэнта Азербайджана Ільхама Аліева.**

Да гэтага, 24 снежня, лідары правялі тэлефонную размову. Тады кіраўнік беларускай дзяржавы цёпла павіншаваў свайго азербайджанскага калегу з днём нараджэння. Прэзідэнты абмеркавалі асноўныя пытанні развіцця двухбаковых адносін, абстаноўку ў рэгіёне і тэматыку сумеснай работы ў рамках шматбаковых пляцовак.

Сустрэча ў Санкт-Пецярбургу прайшла ў развіццё таго, што абмяркоўвалася ў тэлефоннай размове, паведамляе прэс-служба беларускага Прэзідэнта. Парадак дня быў выключна рабочы. Кіраўнікі дзяржаў абмеркавалі маючы адбыцца візіт Прэзідэнта Беларусі ў Азербайджан. «Чакаем у Азербайджане!» — запрасіў Ільхам Аліеў беларускага лідара.

Што да эканомікі, дамовіліся, што адказныя асобы з міжурадавай камісіі і ўрадаў дзвюх краін выпрацуюць план мерапрыемстваў сумеснай работы на наступныя гады. У тым ліку сумесныя кааперацыйныя праекты ў галіне прамысловасці, сельскай гаспадаркі, будаўніцтва і ВПК.

Прэзідэнт Азербайджана пацвердзіў прапанову Беларусі прыняць удзел у мадэрнізацыі і будаўніцтве інфраструктурных аб'ектаў у Карабаху.

Натуральна, абмеркавалі і міжнародны парадак дня — азербайджанскі лідар падрабязна праінфармаваў беларускага калегу аб сітуацыі на Каўказе.

# ПРА ЭКСПАРТ І НЕ ТОЛЬКІ

## У Санкт-Пецярбургу Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Беларусі ў Расіі Дзмітрыя Крутога

**Прэзідэнт абмеркаваў з кіраўніком беларускай дыпмісіі дзве важныя тэмы — далейшую работу ў міжнародных структурах з акцэнтам на эканамічныя пытанні ў ЕАЭС, а таксама дзейнасць камісіі па пытаннях экспарту беларускіх тавараў.**

«АДКБ, СНД і іншыя — там у нас зразумела, што рабіць. Менш праблем, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — А вось эканоміка ў Еўразійскім эканамічным саюзе — гэта вельмі сур'ёзнае пытанне, нягледзячы на тое, што ўжо намі зроблена там. Аб гэтым учора казалі. І ў вузкім, і ў шырокім складзе (на саміце ЕАЭС 25 снежня. — «**Зв.**») абмяркоўваліся праблемы, якія так ці інакш трэба вырашаць».

Прэзідэнт спытаў Дзмітрыя Крутога, што той думае па тэматыцы далейшых перспектыў дзейнасці ЕАЭС. «Усё ж Расія ў нас галоўны прыярытэт тут. На што нам трэба звярнуць увагу?» — пацікавіўся беларускі лідар.

Другім пытаннем, на якое звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы, стала работа камісіі па пытаннях экспарту айчынных тавараў. Яна была створана па даручэнні Прэзідэнта, узначальвае яе Дзмітрый Крутой. «Асноўныя групы тавараў вы разглядаеце камісійна, каб не было скаргаў, не было ніякай крыўды адно на аднаго або, як вынік, карупцыі», — паставіў задачу Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт падкрэсліў, што ўскладае на работу гэтай камісіі вельмі вялікія спадзяванні. «Прайшло фактычна паўгода. Мы можам вынікі падводзіць, гэта дакладна. Ёсць у нас там глабальныя пытанні, па якіх прымаліся рашэнні і дадзены абяцанні, у тым ліку і мне? Як працуе камісія? Ужо калі прайшоў час, як будуць будавацца асноўныя кірункі работы гэтай камісіі на наступны год і на перспектыву?» — абазначыў актуальныя пытанні кіраўнік дзяржавы.

Акрамя канкрэтнага дзелавога парадку дня, Аляксандр Лукашэнка ў час сустрэчы звярнуў увагу і на важнасць захавання гістарычнай памяці і пацікавіўся ў пасла, ці наведалі прадстаўнікі Беларусі Піскароўскія могілкі ў Санкт-Пецярбургу, каб ушанаваць памяць ахвяр блакады Ленінграда. «На Піскароўскіх могілках трэба ўскласці ад Беларусі вянкі, кветкі, — сказаў Прэзідэнт. — Там загінулі нашы людзі. Ленінград пацярпеў дакладна так, як Беларусь, мы заўсёды аб гэтым гаворым. Таму, калі вы яшчэ не пабывалі, трэба пабываць там».

У сваю чаргу Дзмітрый Крутой расказаў, што менавіта з гэтага памятнага мерапрыемства пачаўся дзень для беларускай дэлегацыі. Раніцай 26 снежня кветкі да помнікаў і вечнага агню на Піскароўскіх могілках усклалі міністр замежных спраў Беларусі Сяргей Алейнік, пасол у Расіі Дзмітрый Крутой, а таксама віцэ-губернатар Санкт-Пецярбурга Валерый Масkаленка.

У гэтым годзе ў горадзе адзначаюць 80-годдзе пачатку прарыву блакады Ленінграда, а 27 студзеня 2024 года будзе адзначацца яго поўнае вызваленне. Да важнай памятнай даты ідзе вельмі сур'ёзная падрыхтоўка, створаны аргкамітэт на чале са старшынёй Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Валянцінай Матвіенка.

«Для іх гэта — сакральная тэма», — сказаў пасол.

«Для нас — таксама. Гісторыя...» — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. Беларусь, паводле слоў Прэзідэнта, будзе прадстаўлена на высокім узроўні на мерапрыемствах з нагоды 80-годдзя зняцця блакады Ленінграда. А расійскі бок запрошаны на ўрачыстыя мерапрыемствы, прысвечаныя 80-годдзю вызвалення Беларусі, якое будзе адзначацца ў 2024 годзе.

Акрамя таго, як расказаў пасол на сустрэчы з Прэзідэнтам, беларуская дэлегацыя таксама пабывала каля помніка навучэнцам рамесных вучылішчаў Ленінграда, усклаўшы кветкі і аддаўшы даніну памяці загінулым суайчыннікам.

Помнік быў устаноўлены ў 1996 годзе ў час візіту Прэзідэнта Беларусі ў Санкт-Пецярбург. Гісторыя ў тым, што яшчэ да Вялікай Айчыннай вайны ў горад на Няве з Беларусі на навучанне прыехалі каля 26 тысяч чалавек. За час блакады каля паловы з іх загінулі і былі пахаваны на Піскароўскіх могілках. Гэта маладыя людзі ва ўзросце 14-16 гадоў, і калі пачалася блакада, яны нароўні з дарослымі сталі каля станкоў на прадпрыемствах, уносячы свой уклад у барацьбу з ворагам. «Мы ў гэтым годзе пры ўдзеле нашага генконсульства прывялі гэты помнік у парадак. Таксама ўсклалі кветкі і аддалі даніну памяці. Знакавыя для нас месцы», — сказаў Дзмітрый Крутой.

**Паводле БелТА.**

### У тэму

## Беларусь выходзіць на рэкордны ўзровень экспарту ў Расію

Аб гэтым паведаміў, адказваючы на пытанні журналістаў па выніках сустрэчы, **Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў Расіі Дзмітрый КРУТОЙ.**

Раней кіраўнік дзяржавы даручаў дыпламату вылучыць 75 асноўных пазіцый, якія ахопліваюць прыкладна 70 працэнтаў беларускага экспарту ў Расію, і па іх арганізаваць фактычна штомесячны маніторынг сітуацыі. «Прэзідэнт у першую чаргу заслухаў вынікі работы камісіі па падтрымцы беларускага экспарту, — расказаў пасол. — Вядома, Прэзідэнта цікавілі фізічныя аб'ёмы экспарту».

Гэты індыкатар важны, паколькі дазваляе вызначыць, ці губляецца прысутнасць на расійскім рынку ў тых ці іншых нішах, галінах, ці ўдаецца вытрымліваць канкурэнцыю ва ўмовах паралельнага імпарту, які ісnue ў Расіі, у першую чаргу ад азіяцкіх вытворцаў.

«Ціск (на расійскім рынку) сур'ёзны, — звярнуў увагу кіраўнік дыпмісіі. — Вы бачыце тэмпы росту таваразвароту Расіі з Кітаем, Індыяй, іншымі краінамі Азіі. І таму Прэзідэнт прама спытаў, ці няма тут ушчамлення нашых інтарэсаў, ці не страчваем мы нейкія таварныя групы або таварныя нішы».

Паводле даных пасла, з 75 таварных пазіцый, якія знаходзяцца на яго асаблівым кантролі, толькі па васьмі ёсць невялікае зніжэнне — тэмп росту фізічных аб'ёмаў ніжэйшы за 100 працэнтаў.

«Гэта, скажам так, за апошнія гады рэкордны ўзровень, — канстатаваў Дзмітрый Крутой. — У цэлым тэмп росту фізічных паставак у Расію ў гэтым годзе складае 131 працэнт. У мінулым годзе выраслі на 9 працэнтных пунктаў. Плюс 31 працэнт у гэтым. Відавочна, што ў цэлым сітуацыя выглядае нядрэнна.

«Фактычна ў нас ёсць унікальная магчымасць цяпер на расійскім рынку, улічваючы палітычныя адносіны паміж нашымі лідарамі, улічваючы інтэнсіўнасць рэгіянальных кантактаў», — падкрэсліў пасол.

Напрыклад, сёлета адбылося 19 візітаў кіраўнікоў расійскіх рэгіёнаў у Беларусь, прайшлі іх сустрэчы з Прэзідэнтам. «З $2,7 млрд прыросту ўсяго экспарту ў Расію паўтара прыпадае на 19 рэгіёнаў, якія пабывалі ў Беларусі ў гэтым годзе. Гэта значыць, фактычна палова», — звярнуў увагу Дзмітрый Крутой.

Супрацоўніцтва з расійскімі рэгіёнамі будзе прадоўжана, прычым незалежна ад іх памеру або патэнцыялу. «Прэзідэнт аб гэтым яшчэ раз дакладна сказаў: няма рэгіёнаў малых, сярэдніх і вялікіх. Калі людзі хочуць да нас ехаць, калі хочуць з намі працаваць і ў іх ёсць прапановы, ён з усімі гатовы сустракацца», — падкрэсліў дыпламат.

З улікам павелічэння беларускага экспарту ў гэтым годзе прыкладна на $2,8 млрд агульны аб'ём двухбаковага тавараабароту, паводле прагнозаў Дзмітрыя Крутога, па выніках 2023 года можа выйсці на ўзровень $50 млрд. «Мы на гэта разлічваем», — сказаў пасол.

Па выніках года чакаюцца добрыя паказчыкі па пастаўках не толькі тавараў, але і паслуг. «Вельмі нядрэнна працуюць у гэтым годзе нашы будаўнікі, шэраг знакавых аб'ектаў уведзены ў Расіі, — заўважыў пасол. — На наступны год прэм'ер-міністр нашай краіны ставіць ім амбіцыёзную задачу распрацаваць план падвaення экспартных будаўнічых паслуг у Расію».

«Выдатна працуюць нашы айцішнікі. На групе высокага ўзроўню мы дамовіліся, што вывучым усе нарматыўныя прававыя акты дзвюх краін, якія перашкаджаюць узаемнаму доступу і ўзаемнаму прызнанню айцішных прадуктаў, праграмнага забеспячэння ў розных галінах», — дадаў ён.

Агульны аб'ём перавалкі беларускіх грузаў праз парты Расіі па выніках 2023 года складзе каля 15 млн тон, паведаміў Дзмітрый Крутой. Паводле яго звестак, 20 партоў Расіі задзейнічаны ў перавалцы айчынных экспартных грузаў. У нас на піку 2019 года з выкарыстаннем інфраструктуры Прыбалтыкі і партоў Украіны было 18,8 млн тон. Гэта значыць, яшчэ год-два, і мы наш пікавы аб'ём зможам замясціць партовай інфраструктурай Расіі», — упэўнены пасол.

Асаблівую ўвагу Прэзідэнт таксама даручыў звярнуць на праект транспартнага калідора Поўнач — Поўдзень у рамках Еўразійскага эканамічнага саюза. У гэтым праекце Аляксандр Лукашэнка бачыць вялікі патэнцыял, расказаў пасол.

# ПОЛЮС ІНТАРЭСАЎ

## Беларускія палярнікі пашыраюць плошчу навуковых даследаванняў



**Супрацоўнікамі 16-й Беларускай антарктычнай экспедыцыі выкананы навуковы паход у маладаследаваны прыбярэжны раён Антарктыды — горны масіў «Горы Канавалава». Пра гэта паведаміў начальнік 16-й Беларускай антарктычнай экспедыцыі (16-я БАЭ) Аляксей ГАЙДАШОЎ.**

«У мэтах пашырэння прасторы і плошчы навуковых і практычных інтарэсаў Рэспублікі Беларусь, а таксама ўмацавання прысутнасці нашай краіны ў Антарктыцы супрацоўнікамі 16-й Беларускай антарктычнай экспедыцыі 20—21 снежня 2023 года быў здзейснены наземны навуковы паход у маладаследаваны прыбярэжны раён Антарктыды. Састаў паходнай групы БАЭ — пяць чалавек. Для навуковага паходу былі задзейнічаны дзве транспартныя адзінкі, абсталяваныя сістэмамі GPS-навігацыі, сродкамі спадарожнікавай і УКХ-сувязі. Па ходзе руху навуковага паходу выконваліся фота- і відэаздымка, адбіраліся пробы і ўзоры снежнага покрыва, у ручным рэжыме апорныя пункты даследчага маршруту замацоўваліся на мясцовасці рэперными маркерамі з дзяржаўнай сімволікай Рэспублікі Беларусь», — праінфармаваў Аляксей Гайдашоў.

Агульная працягласць даследчага маршруту склала 70 кіламетраў, агульная плошча навуковых даследаванняў — каля 80 квадратных кіламетраў. Ахопленая дагэтуль нявывучаная навуковымі даследаваннямі плошча прыроднага аб'екта «Горы Канавалава» склала каля 10 квадратных кіламетраў. У працэсе абследавання прыроднага аб'екта зроблена тапагеадэзічная прывязка мясцовасці, праведзены серыі вымярэнняў розных параметраў прыроднага асяроддзя Антарктыкі, праведзены адбор проб і ўзораў прыродных матэрыялаў, выканана ацэнка геахімічнай, геаэкалагічнай, геакрыялагічнай і гідралагічнай сітуацыі прыроднага аб'екта, які даследаваўся.

«Атрыманыя папярэднія вынікі комплексных навуковых пошукаў у горным масіве «Горы Канавалава» маюць перадумовы ацэньваць гэты раён у якасці перспектыўнай зоны навуковага інтарэсу Рэспублікі Беларусь», — паведаміў Аляксей Гайдашоў. — Падчас двухдзённага навуковага паходу паломак тэхнікі, прыбораў і абсталявання не адбылося, парушэнняў тэхнікі бяспекі зафіксавана не было. Навуковыя пробы і ўзоры, матэрыялы і вынікі навуковых даследаванняў дастаўлены на Беларускую антарктычную станцыю «Гара Вячэрняя» ў поўным аб'ёме і будуць перададзены ў НАН Беларусі для далейшага аналізу і вывучэння».

Начальнік 16-й Беларускай антарктычнай экспедыцыі падкрэсліў, што паспяховаму правядзенню навуковага паходу садзейнічала зладжаная камандная работа навукова-тэхнічнага персаналу экспедыцыі, наяўнасць неабходнага асартыменту і надзейная работа тэхнічных сродкаў і навуковага абсталявання, распрацаванага ў інстытутах НАН Беларусі і іншых беларускіх арганізацыях, якія ёсць у распараджэнні БАЭ.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**Фота ўдзельнікаў 16-й БАЭ.**

Сучасны падыход

# Пачатак самастойнага шляху

## Фундамент беларускай дзяржаўнасці быў закладзены ў савецкі час

**У Інстытуце гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук прайшоў круглы стол «Гістарычны шлях Савецкай Беларусі», прысвечаны 105-годдзю абвяшчэння Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі, якое адзначаецца 1 студзеня. Разам з вучонымі ў ім узялі ўдзел палітычныя і грамадскія дзеячы, прадстаўнікі музеяў, бібліятэк, ВНУ і школ, грамадскіх арганізацый. Такі прадстаўнічы склад удзельнікаў сведчыць пра важнасць гэтай тэмы ў сучасным грамадстве. Намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар ЛУЦКІ адзначыў, што з абвяшчэннем Савецкай Беларусі наш народ атрымаў шанц на суверэнны шлях.**

На жаль, многія дасягненні савецкай эпохі забываюцца, а часам і трактуюцца ў негатыўным святле. Сёння варта больш гаварыць пра тое, якая спадчына была створана папярэднімі пакаленнямі. Уласна, дзякуючы стварэнню БССР наша краіна ўпершыню з'явілася на карце свету як палітычны суб'ект. А ў 1939 годзе менавіта савецкая ўлада дапамагла аб'яднанню Усходняй і Заходняй Беларусі. З першых гадоў маладая рэспубліка стала на шлях індустрыялізацыі, пачалі развівацца сацыяльныя праграмы, адукацыя, медыцына, культура, архітэктура. Як адзначылі многія ўдзельнікі круглага стала, менавіта ў савецкі час быў закладзены сацыяльна-палітычны, эканамічны, духоўны і культурны фундамент, на якім сёння стаіць наша краіна.

Як заўважыў **старшыня прэзідыума НАН Беларусі Уладзімір ГУСАКОЎ**, менавіта 1919 год стаў пунктам адліку для практычнага фарміравання нацыянальнай дзяржаўнасці. За кароткі час Савецкая Беларусь ператварылася ў вядучую індустрыяльную рэспубліку з развітой сельскай гаспадаркай і адметнай нацыянальнай культурай. За гады савецкай улады былі створаны ўмовы для развіцця энергетыкі, сучаснага машына- і прыборабудавання, электронікі, радыётэхнікі, нафтахіміі. Трактары і БелАЗы, сістэмы для касмічных станцый, тэлевізары, халадзільнікі, станкі, мінеральныя ўгнаенні і сінтэтычныя валокны — гэту беларускую прадукцыю ведалі і ведаюць больш чым у сотні краін свету. Нацыянальныя творчыя калектывы, беларуская літаратура і мастацтва вядомыя на розных кантынентах.

За кароткі час адбыўся пераход да ўсеагульнай сярэдняй адукацыі, была створана адна з найлепшых у свеце сістэм дашкольнай і пазашкольнай адукацыі. Актыўна развіваліся навуковыя цэнтры. У 1923 годзе створаны Інстытут беларускай культуры, які пачынаў работу з 15 навуковых супрацоўнікаў. Створаная на яго базе беларуская акадэмія навук мела 128 вучоных. Сёння НАН Беларусі — гэта буйная навукова-вытворчая карпарацыя, якая аб'ядноўвае больш за сто арганізацый, у якіх працуе 14 тысяч чалавек. Вучоныя Беларусі разам з замежнымі калегамі выконваюць вялікую колькасць даследаванняў у розных кірунках, у тым ліку ў вывучэнні космасу, развіцці вылічальных і інфармацыйных тэхналогій, нана- і біятэхналогій. Дзякуючы іх даследаванням вырашана праблема біялагічнай, харчовай і гуманітарнай бяспекі нашай краіны. Вялікая ўвага ўдзяляецца вывучэнню гісторыі з самых старажытных часоў. Так, вучоныя даказалі, што людзі на тэрыторыі Беларусі ўпершыню з'явіліся 200—250 тысяч гадоў таму, намнога раней, чым лічылася да гэтага. Самыя ж апошнія даследаванні сведчаць, што людзі былі на нашых землях і 400 тысяч гадоў таму.

Апошнім часам асабліва актыўна вывучаюцца пытанні зараджэння і развіцця беларускай дзяржаўнасці. Як заўважыў Уладзімір Гусакоў, сёння галоўная мэта вучоных — умацаванне незалежнасці Рэспублікі Беларусь, кансалідацыя грамадства.

Абмеркавалі вучоныя і пытанні супрацоўніцтва, у тым ліку з расійскімі калегамі. **Дырэктар Інстытута расійскай гісторыі РАН Юрый ПЯТРОЎ** звярнуў увагу, што ў наступным годзе плануецца правядзенне навуковага форуму, прысвечанага аперацыі «Баграціён», развіццё праектаў, прысвечаных пасляваеннаму аднаўленню Беларусі. Была агучана ідэя аб падрыхтоўцы сумесных работ па гісторыі вядучых прамысловых прадпрыемстваў Беларусі, а таксама вывучэнню лёсаў знакавых гістарычных асоб.

Падводзячы вынікі круглага стала, **акадэмік-сакратар аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі Аляксандр КАВАЛЕНЯ** заклікаў гісторыкаў фармуляваць ідэі, якія будуць працаваць на ўмацаванне беларускай дзяржаўнасці, разам працаваць над стварэннем шматтомнага выдання па гісторыі Беларусі, якое аб'яднае напрацоўкі сучасных даследчыкаў (прычым не толькі гісторыкаў, але і архівістаў, філосафаў, культуролагаў, этнографаў, работнікаў пракуратуры), змесціць сучасныя погляды на гістарычныя падзеі. Фундаментальнае выданне плануюць выпусціць у свет да 2030 года.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

Памяць

# БЕЗ ПРАВА НА ЗАБЫЦЦЁ

**У апошнія снежаньскія дні горад Гарадок адзначыў 80-годдзе са дня вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Раённы цэнтр знаходзіўся ў акупацыі з 9 ліпеня 1941 года да 24 снежня 1943 года. За гэты час германскія войскі амаль цалкам разбурылі горад. Тут дзейнічаў лагер смерці, у якім загінулі 2,5 тысячы чалавек.**

Вызваленне ад фашысцкага прыгнёту прынеслі савецкія войскі 11-й гвардзейскай арміі 1-га Прыбалтыйскага фронту. Гарадоцкая наступальная аперацыя была адной з самых значных падчас прасоўвання Чырвонай Арміі на захад. Гарадок быў вызвалены Савецкай арміяй 24 снежня 1943 года падчас начнога штурму, і гэта дата і цяпер з'яўляецца для мясцовых жыхароў адной з самых важных у гісторыі.

Ушанаваць памяць герояў, якія мужна змагаліся з ворагам дзеля вызвалення Гарадоччыны, сабраліся кіраўніцтва Віцебскай вобласці і раёна, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Арменіі ў Беларусі Размік Хумаран, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый і ўстаноў. Прыехаў у Гарадок і ўнук праслаўленага палкаводца Івана Баграмяна, які кіраваў сіламі 1-га Прыбалтыйскага фронту, — Іван Баграмян.

Адпраўным пунктам маршруту памяці ў гэты дзень па добрай традыцыі стаў помнік-бюст двойчы Герою Савецкага Саюза маршалу Івану Баграмяну. Менавіта аперацыя па вызваленні Гарадоцкага раёна стала першай у ваеннай біяграфіі палкаводца ў якасці камандуючага фронтам.

«80 гадоў таму была праведзена наступальная аперацыя правага крыла 1-га Прыбалтыйскага фронту пад камандаваннем генерала арміі Івана Баграмяна, якая прывяла да вызвалення мястэчка ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Для генерала арміі Івана Баграмяна Гарадоцкая аперацыя была першай буйной кампаніяй, у якой ён дзейнічаў у рангу камандуючага войскамі 1-га Прыбалтыйскага фронту. Гэта ўмова вызначыла імкненне да актыўных наступальных дзеянняў, якое выявілася ў яго рашэннях. Мой дзед асабліва цаніў Гарадоцкую аперацыю, якая пачалася 13 снежня 1943 года і працягвалася да самага Новага года, да 31 снежня. Вырашальную бітву за Гарадок правялі 23 снежня, а 24 снежня ў гонар вызвалення Гарадка ў Маскве быў выпушчаны артылерыйскі салют», — расказаў унук палкаводца Іван Баграмян і ад імя сваёй сям'і выказаў удзячнасць кіраўніцтву Віцебскай вобласці і гораду за тое, што памяць пра вялікага палкаводца беражліва захоўваюць. Мужчына падкрэсліў, што ён, як і яго дзед, лічыць адным з самых галоўных для перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне фактарам было тое, што ўвесь савецкі народ дзейнічаў як адзіны кулак, не падзяляючыся на нацыянальнасці.

**Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Арменіі ў Беларусі Размік ХУМАРАН** адзначыў, што армяне асабліва ганарацца тым, што каля вытокаў Перамогі стаяў іх суайчыннік, чалавек з вялікай літары Іван Хрыстафоравіч Баграмян. «Па розных падліках за нашу краіну плячом да пляча змагаліся ад 55 да 60 тысяч маіх суайчыннікаў. З іх не менш за 10 тысяч навечна засталіся ў вашай зямлі, 15 сыноў армянскага народа былі ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза за вызваленне Беларусі. Прыемна, што памяць аб Іване Баграмяне, імя якога залатымі літарамі ўпісана ў гісторыю, шануюць і дагэтуль. З гэтага пункту гледжання асабліва вылучаецца Віцебшчына. Акрамя бюста Баграмяну і вуліцы, названай у яго гонар у мястэчку, яго імя носіць школа № 46 Віцебска, дзе летась адбылося ўрачыстае адкрыццё мануменатльнай кампазіцыі «Маршал Баграмян і Беларусь», якая адлюстроўвае ўзаемную духоўную сувязь Баграмяна з беларускім народам», — падкрэсліў пасол.

Падчас мітынгу на цэнтральнай плошчы Гарадка **старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр СУБОЦІН** павіншаваў жыхароў і гасцей райцэнтра з важнай датай. «Жыхары Гарадоцкага раёна ўнеслі дастойны ўклад у Вялікую Перамогу. Разам з усёй краінай яны мужна змагаліся з ворагам, будучы ў дзеючай арміі, партызанскіх злучэннях, самаадданa працавалі ў тыле, пасля вызвалення рэгіёна. Восем вашых землякоў удастоены звання Героя Савецкага Саюза, двое сталі поўнымі кавалерамі ордэна Славы, больш за шэсць тысяч узнагароджаны баявымі ордэнамі і медалямі», — адзначыў кіраўнік вобласці.

На святкаванні 80-й гадавіны вызвалення Гарадка і Гарадоцкага раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў старшыня аблвыканкама Аляксандр Субоцін і старшыня Гарадоцкага райвыканкама Ірына Палякова ўрачыста адкрылі ўнікальны электронны інфакіёск «Аўтаматызаваная база даных «Кніга «Памяць» Гарадоцкага раёна», які не мае аналагаў у Беларусі. Ён усталяваны каля брамы мемарыяльнага комплексу «Неўміручасць», у банк дадзеных інфакіёска ўнесены электронныя спісы і інфармацыя аб месцы знаходжання ўсіх воінскіх пахаванняў і пахаванняў ахвяр вайны на тэрыторыі Гарадоцкага раёна, а таксама спісы пахаваных на іх воінаў і мірных жыхароў. Электронны рэсурс змяшчае інфармацыю аб земляках, загінулых і без вестак зніклых у гады Вялікай Айчыннай вайны, звесткі аб героях з апісаннем іх подзвігаў і копіямі архіўных дакументаў.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Еменскія паўстанцы прыгразілі ўзмацніць атакі ў раёне Чырвонага мора



Еменскія паўстанцы-хусіты заявілі аб гатоўнасці да больш магутных нападаў на гандлёвае суднаходства ў раёне Чырвонага мора, паведаміла выданне ААЭ The National. «Наша стратэгічная зброя, радыус яе дзеяння нашмат пераўзыходзяць чаканні нашых ворагаў. Для нас няма «чырвоных ліній», — заявіў міністр абароны ўрада паўстанцаў генерал-маёр Мухамад Аль-Атфі. — Мы наклічам праклён на Чырвонае мора, на Адэнскі заліў, на Аравійскае мора і на Баб-эль-Мандэбскі праліў». Паводле яго слоў, мяцежнікі зберaглі на будучыню больш «хваравітыя дзеянні» супраць камерцыйнага суднаходства ў рэгіёне. Пасля пачатку ваеннай аперацыі Ізраіля ў сектары Газа хусіты паабяцалі, што будуць нападаць на ўсе судны ў Чырвоным моры, якія накіроўваюцца ў Ізраіль, незалежна ад таго, хто імі валодае. Пасля назіральнікі зафіксавалі больш за 100 атак хусітаў з выкарыстаннем дронаў і балістычных ракет, якія прымяняліся супраць гандлёвых суднаў.

## У Аўстраліі з-за ўрагану звыш 120 тысяч дамоў засталося без электрычнасці



Прэм'ер-міністр Квінсленда Стывен Майлз заявіў, што каля 123 тысяч дамоў у аўстралійскім штаце засталося без электрычнасці. Адна жанчына памерла пасля падзення на яе дрэва. Пра гэта паведаміў тэлеканал 9News. Australia. Майлз назваў ураган «беспрэцэдэнтным». Хуткасць ветру дасягала 105 кіламетраў у гадзіну. Паводле слоў прэм'ер-міністра Квінсленда, сотні дамоў на паўднёвым усходзе рэгіёна былі сур'ёзна пашкоджаны. Паводле заявы мясцовых улад, аварыйным брыгадам спатрэбіцца некалькі дзён, каб ліквідаваць наступствы ўрагану і аднавіць электразабеспячэнне. Метэаролагі папярэджваюць, што няўстойлівыя ўмовы надвор'я на тэрыторыі штата захаваюцца. На мінулым тыдні на поўнач Аўстраліі абрынуўся трапічны цыклон «Джаспер», які прывёў да выпадзення рэкорднай колькасці за апошнія 50 гадоў ападкаў і паводак.

## Японскі касмічны апарат выйшаў на арбіту Месяца



Японскі месяцавы пасадачны модуль SLIM (Smart Lander for Investigating Moon) паспяхова выведзены на арбіту Месяца і цяпер будзе рыхтавацца да пасадкі на натуральны спадарожнік Зямлі. Аб гэтым паведаміла Японскае агенцтва аэракасмічных даследаванняў (JAXA). Пасадка на паверхню натуральнага спадарожніка Зямлі плануецца ў сярэдзіне студзеня наступнага года. Першы японскі месяцавы пасадачны модуль SLIM быў запушчаны 7 верасня з дапамогай ракеты-носьбіта H-IIA кампаніі Mitsubishi Heavy Industries (MHI) разам з рэнтгенаўскім тэлескопам XRISM (X-ray Imaging and Spectroscopy Mission), прызначаным для вывучэння космасу з дапамогай рэнтгенаўскай візуалізацыі і спектраскапіі. SLIM павінен будзе адпрацаваць тэхналогію высокадакладнай пасадкі апаратаў у межах 100 метраў (а не кіламетраў, як звычайна) ад запланаванага пункта на паверхні натуральнага спадарожніка Зямлі. У выпадку поспеху місіі SLIM Японія стане пятай краінай пасля СССР, ЗША, Кітая і Індыі, якая ажыццявіла пасадку свайго апарата на паверхню Месяца.

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні родным і блізкім дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога і трэцяга скліканняў Мікалая Васільевіча СЕРГІЕНКІ ў сувязі з яго смерцю.**

Нерухомасць

# Тэндэнцыі жыллёвага рынку

## Сёлета ў Мінску чакаюць рэкордных 17,5 тысячы здзелак

**Адыходзячы 2023-і стаў для айчыннага рынку нерухомасці сапраўднай гонкай з пастаянным павелічэннем хуткасцяў. Увесь год у сталіцы рэкордна павялічвалася колькасць здзелак, раслі цэны на новабудоўлі і на другаснае жыллё, а танныя крэдыты толькі падагравалі цікавасць да таго, што адбываецца. Сёлета рыэлтараў чакалі і змены ў тарыфах. Якія трэнды гэтага рынку?**

### Два ўпэўненыя плюсы

Амаль усе аналітыкі рынку жыллёвай нерухомасці адзначаюць два вельмі важных моманты. Першы — доўгачаканая стабільнасць на рынку. На жаль, пандэмія, эканамічная блытаніна ў свеце і іншыя фактары прымушалі нас увесь час жыць у прадчуванні непрыемнасцяў. У гэтым жа годзе ўсё было адносна спакойна. Другі момант — ліберальная фінансавая палітыка ў дачыненні да ставак па крэдытах. Былі часы, калі пакупнікі бралі крэдыты пад 20 і больш працэнтаў гадавых, цяпер жа ёсць магчымасць крэдытавацца пад 14,5 %. Нядзіўна, што ў гэтым годзе з прыцягненнем крэдытных сродкаў купляецца амаль траціна кватэр. Зразумела, што такая падтрымка істотна пашырае магчымасці пакупнікоў і падымае актыўнасць рынку.

### Добрыя маленькія кватэры каштуюць неймаверна даражэй за вялікія

Як вядома, нерухомасць у нашых рэаліях застаецца самым зразумелым спосабам для захавання сваіх зберажэнняў. Дарэчы, індыкатар цікавасці да гэтага рынку ў якасці інвестыцый — гэта павышаны попыт на маленькія кватэры, лічаць эксперты найбуйнейшага агенцтва нерухомасці Мінска. Цяпер такое жыллё ў сталіцы разыходзіцца вельмі хутка. Людзі разумеюць, што кватэра нікуды не дзенецца: яе можна пакінуць дзецям, здаць у арэнду, перапрадаць праз некалькі гадоў, каб купіць большую.

Па сутнасці, маленькія кватэры — гэта зразумелы, дасягальны і ліквідны спосаб захавання і прымнажэння зберажэнняў для сем'яў, якія адносяцца да сярэдняга класа. У Мінску наогул у гэтым плане перакос цэн. Тут можна знайсці аднапакаёвую кватэру-студыю ў «Мінск-Свеце» або «Новай Баравой» з добрым рамонтам па кошце 1700—2000 долараў за квадратны метр. У той жа час у вялікай кватэры з метражом каля 150—200 метраў, «квадрат» будзе каштаваць 1100—1200 долараў. У гэтым выпадку попыт на нерухомасць у сегменце прэміум-нерухомасці пакуль што не аднавіўся.

### Цана, на жаль, расце

У параўнанні з мінулым годам цэны на другасным рынку ўзраслі, у сярэднім на 6 %. Паводле даных аддзелаў жыллёвага партала, цана квадратнага метра жылля па выніках здзелак у лістападзе ў Мінску склала 1374 долары. Гэта ў сярэднім. Кошт «квадрата» аднапакаёвай кватэры стандартных спажывецкіх якасцяў складае 1300 долараў, двухпакаёвай — 1180, а трохпакаёвай — 1105 долараў. Сярэдні кошт усёй такой аднапакаёвай кватэры будзе да 42 тысяч долараў, двухпакаёвай — 57 тысяч долараў, трохпакаёвай — 69,5 тысячы долараў.

Значна вышэй ацэньваюцца кватэры, гатовыя да пражывання. Квадратны метр аднапакаёвых кватэр з рамонтам роўны ўжо 1650 долараў, двухпакаёвых — 1450, трохпакаёвых — 1350 долараў. Поўны кошт такіх аднапакаёвых кватэр — 54,5 тысячы долараў, двухпакаёвых — 68 тысяч, трохпакаёвых кватэр — 79 тысяч долараў.

Гістарычны максімум цэн мы назіралі ў кастрычніку 2013 года — тады сярэдні кошт метра дасягнуў 1734 долары. На першасным рынку цэны на кватэры сёлета ўзраслі, у сярэднім, на тыя ж 6 %. Сярэдняя цана квадратнага метра ў новабудоўлях горада па выніках лістапада склала 1353 долары. Для параўнання — гістарычны максімум быў адзначаны ў лістападзе 2014 года і складаў 1719 долараў.

### Чым абумоўлены ажыятаж?

Па-першае, гэта адкладзены попыт, звязаны з пандэміяй. Амаль 1,5 года рынак «стаяў». Сваю ролю адыгралі адносна невысокі кошт квадратнага метра і рост прапановы невялікіх кватэр. Таму што, калі мы ўспомнім той жа 2013 год, то тады аднапакаёвыя кватэры па метражы пачыналіся з 42—45 «квадратаў». Цяпер жа на рынку дастаткова варыянтаў 30-метровых кватэр. Гэта значыць, на рост попыту паўплывалі таннасць квадратнага метра, саміх кватэр (з-за іх малых габарытаў) плюс даступнасць крэдытаў. А яшчэ ў параўнанні з 2013 годам узрос і сярэдні заробак.

Спачатку паволі, а потым усё больш жыва расце актыўнасць рынку нерухомасці. У выніку другасны рынак жылля расце трэці год запар. Калі ў 2019 годзе ў Мінску было заключана 13 095 здзелак, то ў 2021-м іх было больш за 14,5 тысячы, а ў 2022-м — больш за 15,8 тысячы. Сёлета мы чакаем ужо больш за 17,5 тысячы здзелак. Гэты год будзе рэкордным па актыўнасці для другаснага рынку. Сёлета ўзрос попыт на якасныя аб'екты — гэта кватэры ў новых дамах і кватэры з добрым аздабленнем ва ўсіх сегментах жылога фонду. Танныя кватэры паступова вымываюцца з рынку, а цэны на тыя, якія засталіся, растуць.

### Рынак будзе актыўны і надалей?

Эксперты прагназуюць, што кардынальных змен на рынку жылой нерухомасці ў наступным годзе не будзе. Пры захаванні бягучай крэдытнай палітыкі з боку Нацыянальнага банка краіны і трэнду росту рэальных даходаў насельніцтва ён будзе актыўны. Пры гэтым варта звярнуць увагу на суадносіны аб'ёмаў продажаў на першасным і другасным рынках. У нашай гісторыі былі перыяды, калі яны прыкметна змяняліся. Так, некалькі гадоў таму на другасным рынку прадавалася каля 15 тысяч кватэр у год, а ў новабудоўлях — каля 17 тысяч. Гэта значыць, першасны рынак апярэджваў другасны. У адыходзячым жа годзе, паводле ацэнак аналітыкаў, колькасць здзелак на першасным рынку знізілася да 10—12 тысяч (летась іх было каля 16—18 тысяч). Гэта тлумачыцца, перш за ўсё, звужэннем прапановы ад забудоўшчыкаў і асцярогамі пакупнікоў укладваць сродкі ў будаўніцтва на працяглы тэрмін. Гэтыя фактары, у сваю чаргу, паўплывалі і на рост актыўнасці пакупнікоў на другасным рынку кватэр.

Калі рынак новабудоўляў будзе і далей змяншацца ў аб'ёме, гэта прывядзе да далейшага павелічэння попыту на гатовае жыллё і, як вынік, павелічэння цэн на другасным рынку.

### Апартаменты для бізнесу і розныя дагаворы для пакупнікоў і прадаўцоў

Самая новая тэндэнцыя гэтага сезона — апартаменты. У Мінску ўсё большую папулярнасць набірае такі тып нерухомасці. Апартаменты — па сутнасці, тыя ж кватэры, але ў іх можна не толькі жыць, але яшчэ і весці бізнес. Новы фармат у нас (але не расійскага і сусветнага рынкаў, дзе гэты механізм з'яўляецца вельмі папулярным для дробнага і сярэдняга інвестара) стаў даволі значным на аб'ёме ў жылым комплексе «Мінск-Свет». Гэта адзіны на сёння фармат жылля, прыдатнага як для пражывання, так і для рэгістрацыі і вядзення малога і сярэдняга бізнесу. Невялікі метраж, нізкі кошт квадратнага метра і выгадныя ўмовы па растэрміноўцы і крэдытаванні робяць гэты фармат нерухомасці сапраўды прывабным.

Складана пакуль даваць свой аналіз па рынку апартаментаў, бо гэта абсалютна новы тып нерухомасці для Мінска, і гатовых вялікіх комплексаў пакуль што няма. Дарэчы, у апартаментах можна зарэгістравацца, а значыць, і камунальныя паслугі будуць аплачвацца па меншых тарыфах. Акрамя таго, нормы для жылых памяшканняў на апартаменты не распаўсюджваюцца. Такім чынам, былі адменены велізарныя камунальныя тарыфы для юрыдычных асоб, якія звязаны з камерцыйнай нерухомасцю і нежылым фондам.

Акрамя таго, у прынятай пастанове ўрада аб тарыфах прапісана магчымасць рабіць зніжкі, з'явілася больш дакладнае апісанне многіх працэсаў (напрыклад, уведзена



яснае вызначэнне «падбору варыянтаў»). Выключная большасць агенцтваў нерухомасці ацэньвае гэтыя змены станоўча і лічыць іх прагрэсіўнай падзеяй для рынку нерухомасці краіны.

Вызначана, што агенцтва не могуць адначасова працаваць з пакупніком і прадаўцом. Паколькі яны пераследуюць розныя мэты (адзін хоча прадаць даражэй, другі — купіць танней), то знаходзяцца ў стане перманентнага канфлікту інтарэсаў. Таму значна прасцей выбудоўваць работу, калі ў кожнага боку ёсць свой дагавор на рыэлтарскую паслугу і свой прафесійны прадстаўнік інтарэсаў па здзелцы.

Гэта пацвярджае і статыстыка — не менш за 50 % пакупнікоў, якія прыходзяць за канкрэтнай кватэрай, настойваюць на заключэнні дагавора. Так камфортней, спакайней і бяспечней. Дагавор дае пакупніку магчымасць мець страхоўку, свайго «асабістага», а не «агульнага» кваліфікаванага спецыяліста, права патрабаваць ад рыэлтарскай кампаніі выканання абавязацельстваў і паслуг, якія не вельмі патрэбныя прадаўцу.

Агенцтву дагавор дае магчымасць каректна працаваць у інтарэсах пакупніка з персанальнымі данымі прадаўца і трэціх асоб, якія маюць дачыненне да здзелкі. Хутчэй за ўсё ўжо хутка моцна ўзрасце колькасць сумесных здзелак паміж рознымі агенцтвамі, якія прадстаўляюць інтарэсы прадаўца і пакупніка.

### Без студэнцкага буму

Многія эксперты адзначаюць, што на рынку арэнды жылля на працягу ўсяго года захоўвалася спрыяльная тэндэнцыя. У канцы лета і пачатку восені не здарылася традыцыйнага студэнцкага буму, што было чакана, бо ў Мінску адкрываецца ўсё больш інтэрнатаў для навучэнцаў. Таму заўсёды былі прапановы пад любы бюджэт і не было рэзкіх скачкоў кошту арэнды.

### Час купляць дачу

З прыходам халадоў назіраецца спад на рынку загараднай нерухомасці. У прыватнасці, у сегменце адрамантаваных гатовых дач з усімі камунікацыямі, якія прыдатныя для круглагадовага пражывання, адзначаецца прыкметнае зніжэнне цэн.

Калі летам лецішча да 25 кіламетраў ад Мінска з рамонтам і камунікацыямі можна было купіць за 50-60 тысяч долараў, то некаторыя ўласнікі такой нерухомасці панізілі цэны да 40 тысяч долараў.

### Офісаў больш, чым патрэбна

Калі мякка апісаць сітуацыю, то ў апошні час рынак офіснай нерухомасці перажывае пэўныя цяжкасці. Аб'ёмы прапанаваных у арэнду офісаў на гістарычным максімуме — у Мінску вакантныя больш за 200 тысяч квадратных метраў. Для параўнання ў 2019-м было каля 40 тысяч «квадратаў» пустых плошчаў.

Пры гэтым у гандлёвым і складскім сегментах, у адрозненне ад офіснага, усё інакш. Асноўны стрэс для рынку гандлёвай нерухомасці прыйшоўся на 2020-ы, але ўжо да канца года сітуацыя палепшылася. У наступныя два гады рынак гандлю адчуваў сябе стабільна, захаваўшы попыт і арэндныя стаўкі. Варта адзначыць, што сёння ў Мінску дастаткова гандлёвых цэнтраў, што пацвярджаецца павелічэннем тэрмінаў іх запаўнення. Новыя ГЦ будуць запатрабаваныя толькі ў раёнах з новай жылой забудовай пры адсутнасці інфраструктуры падобнага фармату.

---

Надвор'е

# МОЦНЫ ВЕЦЕР, ТУМАН І ГАЛАЛЁД...

**Снег, мокры снег, а днём яшчэ і з дажджом — вось такое надвор'е чакае нас у апошнія дні года, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя.**

А ў сераду надвор'е будуць вызначаць атмасферныя франты ад цыклону, цэнтр якога будзе перамяшчацца з краін Балтыі на Разанскую вобласць Расіі праз паўночныя раёны нашай краіны. Воблачна з праясненнямі. Ноччу часам ападкі, днём на большай частцы тэрыторыі краіны кароткачасовыя ападкі ў выглядзе снегу, мокрага снегу і дажджу. Месцамі па краіне наліпанне мокрага снегу, слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Вецер заходні, паўночна-заходні моцны парывісты. Максімальная тэмпература паветра днём будзе ад нуля да 6 цяпла.

У чацвер адаб'ецца ўплыў няўстойлівых паветраных мас і франтальных раздзелаў, якія ссоўваюцца з боку Заходняй Еўропы. Будзе воблачна з праясненнямі. Уначы па паўночным усходзе, днём месцамі па краіне пройдуць ападкі ў выглядзе снегу, мокрага снегу і дажджу. У асобных раёнах — слабыя туман і галалёд, на дарогах — галалёдзіца. Вецер заходні з пераходам на паўднёвы парывісты, ноччу па ўсходзе месцамі моцны парывісты. Тэмпература паветра мінімальная ноччу складзе ад нуля да 6 марозу, а максімальная днём ад мінус 2 градусаў па паўночным усходзе да 6 цяпла па паўднёвым захадзе краіны.

У пятніцу чакаецца досыць вільготна і ветрана. У гэты дзень працягнецца прыток вільготных няўстойлівых паветраных мас атлантычнага паходжання. Воблачна з праясненнямі. На большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць ападкі ў выглядзе дажджу, ноччу з мокрым снегам. Уначы і раніцай у асобных раёнах слабыя туман і галалёд, на дарогах галалёдзіца. Вецер паўднёва-заходні парывісты, удзень месцамі моцны парывісты. Тэмпература паветра мінімальная ноччу ад мінус 2 градусаў да 5 цяпла, а днём адліга, калі чакаецца ад плюс 1 градуса па паўночным усходзе да 9 цяпла па паўднёвым захадзе краіны.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у суботу і нядзелю мы будзем хлюпаць нагамі. А ўсё таму, што ў апошнія два дні года часам чакаюцца ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Ноччу і раніцай у асобных раёнах прагназуюцца слабыя туман і галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 2 градусаў да 5 цяпла. Днём будзе 1—8 цяпла.

Будзе ісці дождж з мокрым снегам і 1 студзеня. У асобных раёнах слабыя туман і галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 2 градусаў да 5 цяпла. Днём будзе ад нуля да плюс 6 градусаў.

**Матэрыялы паласы падрыхтаваў Сяргей КУРКАЧ.**

# ГРУШКА, ШТО ПАКІДАЕ НАДЗЕЮ

Менавіта яна, гаротная сірата, пасвіла неяк чужых авечак на пагорку. Неба зацягнулася хмарамі, грымнула страшная навальніца. Дзіця схавалася пад дзікую грушку, што расла ў полі. Ды галіны дрэва не закрылі небараку ад халоднага дажджу. Малая пастушка прамокла, скалела, і такая журба яе агарнула, што стала яна горка плакаць, маліцца Святой Багародзіцы, расказваць пра сваю горкую сірочую долю. Тады і з'явілася беднай сіраце Божая Маці, каб суцешыць яе і прадказаць шчаслівае жыццё. Да таго ж, ад нараджэння Параска кепска бачыла, а тут ёй вярнуўся зрок. Было гэта недзе ў 1899-1900 гадах.

Дзяўчынка прыбегла ў вёску ўзрадаваная, прасветленая, расказала людзям пра тое, што здарылася, і ёй паверылі. Вяскоўцы пацягнуліся да дзічкі, і неўзабаве там сталі адбывацца цуды. Ёсць шмат гісторый на гэты конт. Расказвалі, напрыклад, пра маленькага хлопчыка, які да трох гадоў не хадзіў, яго прынесла маці да грушкі, доўга і горача малілася. А калі, стомленая, сабралася ісці дадому, паклікала сына залазіць на плечы, ён сказаў, што сам пойдзе. І пайшоў ножкамі. Пра другую жанчыну казалі, што яна несла крыж да грушы аж ад самай вёскі, рукамі выкапала пад яго яму, замацавала крыж, малілася пад ім, і дачка яе выздаравела.

## Барацьба з Грушкай і яе шанаванне

Пагалоска пра цудоўную грушку пайшла па ўсёй ваколіцы, а мясціну сталі называць Грушкай альбо Святой Грушкай. Людзі неслі крыжы і маліліся за сваіх родных, якія хварэлі. Калі пачалося масавае паломніцтва, станавы прыстаў распарадзіўся ссекчы грушу, але людзі не далі. Больш за тое, грамада вырашыла сабраць грошы і паставіць побач царкву. Ужо і будаўнічы матэрыял падрыхтавалі, ды здарылася Першая сусветная вайна. Дрэва тым часам расло, убіралася ў сілу. Але за польскім часам нехта выкупіў зямлю побач і ўсё ж такі зрэзаў грушу. Толькі яна зноў узрасла на тым жа месцы.



Надзея КАРПУК.

Людзі палічылі, што гэта знак. І перад самай вайною, у пачатку 40-х, ва ўрочышчы Грушка была ўзведзена драўляная капліца на каменным падмурку. У Надзеі Іванаўны, як дарагая рэліквія, захоўваецца здымак таго часу. Тады тэрыторыю святога месца ўпершыню абнеслі агароджай. Пад грушай устанавілі абраз Успення Прасвятой Багародзіцы. У той час недзе дзве трэці агароджанай плошчы было занята крыжамі. А ў дзень Успення Прасвятой Багародзіцы (28 жніўня) да святога месца здзяйсняліся масавыя шэсці. Людзі пакланяліся Божай Маці, прасілі заступніцтва і благаславення. А на крыжах былі занатаваны даты іх устаноўкі — пачынаючы з 1910 да 1953 года.

Але ў 50-я гады ва ўлады дайшлі рукі і да Грушкі. У архівах знайшоўся дакумент за 1960 год, у якім упаўнаважаны па справах рэлігіі па Брэсцкай вобласці рапартаваў: «Праведзеная значная работа па ліквідацыі так званых «святых месцаў» — «Грушка» Высокаўскага раёна (цяпер Камянецкі раён. — **Аўт.**) і іншыя, куды раней здзяйсняліся паломніцтвы вернікаў».

Надзея Іванаўна добра памятае той дзень, што стаў трагедыяй для ўсёй вёскі. На досвітку яна, 15-гадовая, выбегла з хаты, і ўбачыла на гары пад грушай людзей, тэхніку. Вярнулася, сказала бацьку. Той хуценька сеў на матацыкл і паехаў ва ўрочышча. А там ужо стаялі салдаты, міліцыя, месца ачапілі. Улічылі папярэдні вопыт, калі хацелі знесці Грушку мясцовымі сіламі, а жанчыны наляцелі з граблямі, віламі ды разагналі брыгаду.

На гэты раз падрыхтаваліся грунтоўна. У сем гадзін раніцы пачалі і да дванаццаці дня не засталося ні грушы, ні капліцы, ні крыжоў. Зямлю аддалі пад ворыва, пасеялі сельгаскультуру. Але што цікава, тутэйшыя трактарысты ніколі не аралі зямлю, дзе расла груша. У кожнага ж былі жонка, маці, якія строга наказвалі зямлю ў тым месцы не чапаць. І праз некалькі гадоў дрэўца зноў адрасло са старога карэння. Людзі, як і раней, панеслі крыжы, пайшлі з малітвамі да Грушкі. З часам на ранейшым месцы з'явілася каля дзвюх соцень крыжоў.

Чарговая ліквідацыя прайшла 9 чэрвеня 1980 года. Частку крыжоў адправілі на паліва ў мясцовыя школу і бальніцу, другую частку адвезлі ў лес і кінулі там. А ў вёсцы сталі заўважаць, што тыя, хто займаўся знішчэннем святога месца, сталі паміраць заўчасна: адзін на балоце загінуў, другі ў калодзеж упаў, трэці наогул рукі на сябе налажыў.

## Гісторыя славутасці

Але грушка і на гэты раз вырасла, і людзі зноў пайшлі да яе. І цяпер ва ўрочышчы Святая Грушка стаяць сотні крыжоў. Іх устанаўліваюць ад свайго імя, ад імя прадпрыемстваў і арганізацый, павязваюць рознакаляровымі стужкамі. У 2012 годзе побач з вядомым дрэвам была пабудавана і асвечана невялікая царква. Кожны год, 27 жніўня, напярэдадні Успення Прасвятой Багародзіцы, сюды прыязджаюць святары, служаць малебен. З усіх навакольных вёсак ідуць паломнікі, каб папрасіць у Божай Маці здароўя і заступніцтва, працягнуць традыцыю шанавання месца, дзе Яна з'явілася дзіцяці.

Устанавіўся звычай рыхтаваць трапезу да свята. У гэты дзень гаспадыні прыносяць з сабой розныя стравы, пасля набажэнства накрываюць сталы, і кожны паломнік можа падсілкавацца, перш чым накіравацца дадому. Калі яшчэ сталоў не было, то слалі на зямлі абрусы доўгай паласой і перакусвалі такім чынам. Цяпер усё робіцца больш культурна і цывілізавана. Традыцыю шанавання Грушкі ўсебакова вывучылі работнікі аддзела культуры Камянецкага райвыканкама, прадставілі дакументы ў адпаведны савет пры Міністэрстве культуры. Некалькі гадоў таму «Традыцыя паломніцтва і пакланення «Грушка» была ўключана ў спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны краіны.

...А грушка стаіць прыбраная, нібы тая нявеста. У любую пару яна расквечана яркімі стужкамі, касынкамі з бантамі. Тэрыторыя вакол добраўпарадкаваная, пакладзена плітка, пастаўлена агароджа. У свой час унёсак зрабіў мясцовы калгас, прыхаджане са святаром, грошы ахвяроўвалі землякі. Парадак падтрымліваюць актывісты на чале з Надзеяй Карпук.

Тут ёсць і абразы, перад якімі моляцца вернікі. Кажуць, што адна з ікон засталася з самай першай капліцы.

— Можна пачуць меркаванне, што, маўляў, трэцяя па ліку грушка не мае сілы той, самай першай, пад якой здараліся цуды, — разважае Надзея Карпук. — Але справа не ў дрэве, а ў моцнай веры людзей, якая асаблівым чынам праявілася ў гэтым месцы, куды прыходзілі маліцца некалькі пакаленняў нашых аднавяскоўцаў. Гэта месца асаблівае. Яно каштоўнае як сваёй святасцю, так і шанаваннем даўняй традыцыі. Нездарма ж яго параўноўваюць з польскай Грабаркай. Для мяне, маіх дзяцей, унукаў ды іншых нашых аднавяскоўцаў Грушка яшчэ і як памяць пра нашу былую вёску. Адносна нядаўна гэта быў вялікі населены пункт з насельніцтвам 675 чалавек. У Бушмічах працавалі сельсавет, калгас, школа, клуб, бібліятэка, ФАП, аддзяленне сувязі. З часам, калі гаспадарку далучылі да другой, жыццё стала сыходзіць адсюль. Цяпер у вёсцы пражывае літаральна два дзясяткі чалавек, няма ніводнай грамадскай установы. Цяпер Грушка — наша галоўная славутасць.

З Надзеяй Карпук мы наведвалі Грушку прыгожым кастрычніцкім днём, калі ярка свяціла сонца, а лісты на дрэве былі яшчэ не жоўтыя, а спрэс зялёныя. Паводле слоў Надзеі Іванаўны, Грушка прыгожая заўсёды. Нават цяпер, калі снежанскі туман даеў апошні снег, што выпаў на пачатку зімы, сама груша радуе вока сваім стракатым рукатворным убраннем. Да яе не зарастае сцяжына. Людзі ідуць у любую пару года, бо прасіць у Божай Маці заступніцтва ёсць нагода заўсёды.

**Святлана ЯСКЕВІЧ,**
**фота аўтара.**
*Камянецкі раён.*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Працяг тэмы

# ЗВАНОК З БРАКАВА-2

**У лістападзе «Звязда» пісала пра праблемы вёскі Бракава Магілёўскага раёна. Сужэнцы Галіна і Міхаіл Макары і іншыя жыхары паскардзіліся на дрэнныя дарогі, праблемы з іх ачысткай, а таксама складанасці з наведваннем медыцынскай установы ў суседніх Княжыцах. Разам з жыхарамі карэспандэнт «Звязды» пабывала ва ўсіх праблемных месцах населенага пункта, пасля чаго выйшаў рэпартаж. Сёння мы прапануем азнаёміцца з пазіцыяй Магілёўскага райвыканкама наконт гэтай сітуацыі.**

Рэдакцыя атрымала афіцыйны адказ на публікацыю за подпісам **намесніка старшыні Магілёўскага райвыканкама Ірыны КУРАШОВАЙ**. Ён амаль не адрозніваецца ад таго, які яшчэ ў кастрычніку быў накіраваны гэтай жа ўстановай жыхарам на іх скаргі. Заяўнікі яго, мякка кажучы, палічылі адпіскай і патэлефанавалі ў карпункт газеты «Звязда». Адрозненне ліста, які праслаў Магілёўскі райвыканкам у рэдакцыю, толькі ў крыху актуалізаваным пачатку, каб было зразумела, што адказ на гэты раз даецца не жыхарам, а газеце. Адзіная цалкам новая інфармацыя — абзац у канцы, — што ў Княжыцкую амбулаторыю штомесячна выязджаюць вузкія спецыялісты Магілёўскай паліклінікі № 3. Гэта цудоўна, але ж яны прыязджаюць не ў Бракава. Для жыхароў Бракава паездкі ў Княжыцкую амбулаторыю таксама сур'ёзная праблема. У астатнім тэкст слова ў слова супадаў з тым, што паказвалі карэспандэнту газеты жыхары. Такім чынам, на гэты раз адпіску атрымала рэдакцыя.

Артыкул быў апублікаваны з мэтай, каб адказныя асобы больш уважліва азнаёміліся з праблемамі жыхароў Бракава. У тым, што яны ёсць, карэспандэнт асабіста пераканалася на месцы.

У вёсцы жыве каля 500 чалавек (у асноўным пенсіянеры), тэрыторыя населенага пункта дастаткова вялікая, у некаторых месцах адлегласць паміж дамамі вымяраецца сотнямі метраў, а вуліцы па працягласці — кіламетрамі. Напрыклад, тым жа сужэнцам Макарам ад іх дому на вуліцы Лясной да прыпынку грамадскага транспарту ісці амаль чатыры кіламетры. Іх, як і некаторых іншых тутэйшых жыхароў выручаюць асабістыя аўто. Пэўная частка карыстаецца веласіпедамі. Усе астатнія перасоўваюцца пешшу. Летам крыху весялей, а вось зімой, асабліва калі яна снежная, лепш заставацца дома. Па вуліцы нават машыны не заўсёды могуць праехаць, абураюцца жыхары.

Не лепшым чынам на вясковыя вуліцы ўплывае грузавая тэхніка агракамбіната «Зара». Населены пункт мяжуе з палямі аграгаспадаркі і падчас уборачнай грузавікі са збожжам, па словах жыхароў, курсіруюць наўпрост праз яго. Сёлета на вуліцы Цэнтральнай здарылася аварыя: пад цяжарам машыны, расказалі заяўнікі, зламалася водаадводная труба. Яму, якая ўтварылася, засыпалі пяском. Не ўлічылі толькі, што месца забалочанае, і вада цяпер збіраецца на дарозе. І першае, на што звярталі ўвагу жыхары, было пытанне: калі памяняюць зламаную водаадводную трубу на новую?

А вось у адпісцы, якая прыйшла з райвыканкама, адзначана, што «вулічна-дарожная сетка Бракава знаходзіцца ў задавальняльным стане, і работы па бягучым рамонце выкананыя ў межах выдзеленых сродкаў». Дададзена таксама, што абслугоўвальнай арганізацыі, якой з'яўляецца Магілёўскае раённае прадпрыемства «Жылкамгас», даручана вясной наступнага года выканаць неабходны комплекс работ па паляпшэнні спажывецкіх якасцяў дарогі. Узнікае новае пытанне: а будзе ўключана ў гэты комплекс работ замена водаадводнай трубы ці не? Прыйдзецца, напэўна, чакаць вясны, каб даведацца пра гэта, бо ў райвыканкаме і па тэлефоне пра трубу нічога не змаглі ўдакладніць.

Жыхароў таксама турбавала праблема з ачысткай вуліц ад снегу, бо мінулай зімой спецтэхніка на іх не з'яўлялася. У адказе з райвыканкама гаворыцца, што на зімовы перыяд вуліцы Лясная і 2-я Калгасная замацаваны за агракамбінатам "Зара", ён павінен ачышчаць іх ад снегу. Спасылка робіцца на адпаведнае рашэнне Магілёўскага райвыканкама ад 19 снежня 2022 года № 24-30. На жаль, у райвыканкаме не паведамілі, хто кантралюе выкананне гэтага рашэння.

Пытанні № 3 і № 4, якія цікавілі жыхароў, звязаныя з нязручнасцю новага месца размяшчэння прыпынку грамадскага транспарту (ён знаходзіцца ледзь не ў полі) і даступнасцю медыцынскіх паслуг. У каментары да папярэдняга артыкула «Званок з Бракава» (№ 215 «Звязды») старшыня Княжыцкага сельсавета Віктар Палтаран патлумачыў, што месца для прыпынку абрана з улікам інтарэсаў аўтапарка (ёсць, дзе развярнуцца аўтобусу) і з мэтай абслугоўвання нешматлікіх жыхароў яшчэ аднаго населенага пункта Лахва. Менавіта адсюль можна даехаць да Княжыц, дзе знаходзіцца цэнтр сельсавета і медыцынская амбулаторыя. Некалькі гадоў таму ў Бракава закрылі ФАП. Вось толькі аўтобусны маршрут не прадумалі. Амбулаторыя прымае пацыентаў з 8.00 да 12.00, пасля абеду абслугоўвае насельніцтва сельсавета на доме. І калі прыехаць грамадскім транспартам на прыём можна, то вярнуцца такім жа чынам складана: альбо няма аўтобуса, альбо трэба яго чакаць да вечара (па пятніцах — трохі менш, але ўсё роўна некалькі гадзін). Пешшу да вуліцы Лясной у Бракава ісці каля сямі кіламетраў.

Жыхары кажуць, што, калі б не Галіна Макар, якая да пенсіі працавала медыкам і можа нешта параіць, яны б не ведалі, што рабіць. Намеснік старшыні Магілёўскага райвыканкама Ірына Курашова паабяцала, што Магілёўскаму аўтапарку № 1 будзе рэкамендавана пераглядзець рух прыгарадных аўтобусаў. Яна таксама пагадзілася, што трэба будзе разабрацца і з адносінамі да сваіх абавязкаў па ачыстцы ў зімовы перыяд вуліц Бракава ад снегу з кіраўніцтвам агракамбіната «Зара», і наогул з правамернасцю арганізацыі руху сельскагаспадарчай тэхнікі гэтай жа гаспадаркі па вуліцах населенага пункта. Відавочна, нам яшчэ раз прыйдзецца вярнуцца да гэтай тэмы, але ўжо ў наступным годзе. Бо праблемы засталіся, і іх трэба вырашаць.

***P.S.***

*Напрыканцы прыемная навіна пра тое, што пасля тэлефонных размоў журналіста «Звязды» з райвыканкамам жыхароў Бракава пачулі. Яны паведамілі, што наступствы снегападу, які абрынуўся на вобласць у пачатку снежня, у Бракава своечасова ліквідавала тэхніка агракамбіната «Зара».*

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

Бяспечная зіма

# Як пазбегнуць траўмаў?

**Па статыстыцы, зімовы траўматызм перавышае летні ў два-тры разы. Пры гэтым 65-72 % усіх траўмаў прыпадае на цяжкія пашкоджанні апорна-рухальнага апарату — пераломы костак і сустаўныя вывіхі. Зрэшты, удары мяккіх тканак і расцяжэнні звязак таксама не рэдкасць. Як зрабіць, каб зімовы адпачынак, у тым ліку паляванне і рыбалка, не прывёў да сумных наступстваў, расказалі спецыялісты.**



## НА ВУЛІЦЫ І НА ГОРЦЫ

Штогод у Беларусі траўмы атрымліваюць каля 700 тысяч чалавек, у тым ліку дзяцей. За апошні год траўматызм павялічыўся на 5 % у параўнанні з папярэднім.

Найбольшую колькасць траўмаў атрымліваюць мінчане — у сталіцы ўзровень траўматызму максімальны ў параўнанні з рэгіёнамі. Ён складае 6785 пацыентаў на 100 тысяч насельніцтва і 8016 дзяцей. Найменшы ўзровень траўматызму ў Віцебскай вобласці — 3938 чалавек на 100 тысяч насельніцтва.

Пераважаюць бытавыя траўмы, яны складаюць 80 % у дарослых і 52 % у дзяцей. На другім месцы — вулічныя траўмы (12 % дарослых і 34 % дзяцей).

— Тэхнічны прагрэс, на жаль, стварае траўманебяспечнае асяроддзе. У апошнія гады характэрная адна з самых небяспечных траўмаў дзяцей — пры катанні на горках на цюбінгу. Гэта даволі простая канструкцыя, але ён мае відавочныя мінусы. Гэта некіравальнасць і даволі высокая хуткасць, таму траўмы звычайна даволі сур'ёзныя — ад пераломаў канечнасцяў да пераломаў пазваночніка, — расказвае **ўрач-траўматолаг-артапед, малодшы навуковы супрацоўнік лабараторыі траўматалогіі дарослага ўзросту РНПЦ траўматалогіі і артапедыі Андрэй БАКАНОЎСКІ.** — Але варта адзначыць, што за апошнія гады колькасць гэтых траўмаў паменшылася. Калі ў 2021 годзе было зафіксавана 414 выпадкаў, то ў 2023-м — 132.

Напярэдадні працяглых зімовых свят спецыяліст параіў асаблівую ўвагу ўдзяляць дзецям, асабліва пры катанні на горках, дзе важна выбіраць бяспечныя спускі. Дарослым жа таксама важна паводзіць сябе бяспечна, асабліва ў алкагольным ап'яненні, і не захапляцца ў такім стане зімовымі актыўнасцямі.

Таксама неабходна выбіраць бяспечны абутак і кантраляваць надвор'е, асабліва пажылым людзям.

— Калі перадаюць, што ёсць прыкметы галалёду, то пажылому чалавеку лепш застацца дома. У гэтай групе насельніцтва вялікая колькасць траўмаў ад падзення з вышыні ўласнага росту. Таксама ў галалёд варта паспрабаваць нікуды не выязджаць на аўтамабілі, каб пазбегнуць ДТЗ, — парэкамендаваў Андрэй Баканоўскі.

Калі дзіця атрымала траўму, лепш за ўсё выклікаць «хуткую».

— Не варта актыўнічаць, а трэба дачакацца спецыялістаў. Дзіця звычайна пры такой траўме мае абцяжаранае дыханне, якое потым аднаўляецца. Калі гаварыць пра людзей пажылога ўзросту, звычайна яны атрымліваюць траўмы ніжніх канечнасцяў — пераломы сцягна, шыйкі сцягна. Тут варта зафіксаваць канечнасць, даць абязбольвальнае, калі яно маецца, і выклікаць «хуткую», даставіць пацыента ў траўмапункт для аказання спецыялізаванай дапамогі, — параіў Андрэй Баканоўскі.

## НА ПАЛЯВАННІ І РЫБАЛЦЫ

Такія віды вольнага часу, як паляванне і рыбалка, здавалася б, не самыя траўматычныя. Але і тут няшчасныя выпадкі здараюцца, больш за тое, прыводзяць да смерці.

— У многіх зараз на слыху няшчасны выпадак, які нядаўна здарыўся на калектыўным паляванні ў Смалявіцкім раёне. Варта сказаць пра яго больш падрабязна, каб паляўнічыя зрабілі правільныя для сябе высновы, бо гэты смяротны выпадак адбыўся ў першую чаргу з-за парушэння тэхнікі бяспекі на паляванні, — адзначае **намеснік начальніка ўпраўлення палявання, рыбалоўства і турызму РДГА «Беларускае таварыства паляўнічых і рыбаловаў» Уладзімір КАЗЛОЎСКІ.** — Паранены дзік выйшаў на паляўнічага, які стаяў на сваім так званым нумары, і перасёк стралковую лінію. Паляўнічы, не чакаючы заканчэння загону і распараджэнняў кіраўніка палявання, які ва ўстаноўленым парадку прысутнічаў, самастойна вырашыў пайсці за гэтай жывёлай з мэтай дабраць падранка. І, на жаль, наблізіўся вельмі блізка — дзік напаў. Жывёла аказалася буйным самцом. І акрамя таго, што ён паранены, дзікі ў цэлым даволі агрэсіўныя, бо ў іх зараз перыяд гону. Ён нанёс паляўнічаму вельмі сур'ёзнае раненне — пашкодзіў сцёгнавую артэрыю, што прывяло да вялікай страты крыві і смерці. Калегі па паляванні нават не паспелі прыйсці на дапамогу.

Спецыяліст нагадаў, якія правілы безумоўна варта выконваць падчас палявання.

— Калі б гэты паляўнічы дачакаўся заканчэння загону і кіраўніка палявання, і той прыняў рашэнне, якія дзеянні праводзіць па даборы гэтага падранку, такога здарэння б не адбылося. Калі б ён самастойна не зняўся са свайго нумара і не пайшоў за дзікам, зноў-такі, гэта б не прывяло да такіх сумных наступстваў. Таму патрабаванні да ўсіх паляўнічых такія: абавязкова на калектыўных паляваннях слухаць і выконваць указанні кіраўніка палявання. І ў цэлым выконваць іншыя правілы тэхнікі бяспекі — стральба ажыццяўляецца пераважна падчас загону, яна забаронена ўздоўж стралковай лініі і па невыразна бачнай мэце, — падкрэсліў Уладзімір Казлоўскі.

У гэтым сезоне ўжо зафіксавана і некалькі выпадкаў гібелі рыбакоў. Ёсць правілы і для зімовай рыбалкі, якія трэба няўхільна выконваць.

— Першы лёд вельмі каварны. Людзі проста не могуць прадказаць яго стан і правальваюцца. Вада вельмі халодная, і часу на выратаванне няшмат. Калі чалавек адзін на рыбалцы, ён рэдка можа выбрацца без спецыяльных сродкаў на лёд самастойна і, на жаль, гіне ад пераахаладжэння або ад утаплення. Таму рыбаловам рэкамендуецца таксама выконваць элементарныя правілы бяспекі. Не выходзіць на лёд таўшчынёй менш за 7 см. Не збірацца вялікімі групамі ў адным месцы, асабліва калі рыбалка па першалёдзе. Не свідраваць шмат лунак у адным месцы і мець пры сабе індывідуальныя сродкі выратавання, так званыя ратавалкі — гэта спецыяльная прылада, якая дазволіць зачапіцца за лёд у выпадку, калі раптам вы праваліліся, і выбрацца. І быць гатовымі прыйсці на дапамогу да іншых рыбаловаў, якія трапілі ў такую сітуацыю, — дадаў Уладзімір Казлоўскі.

# Ёлачныя ўпрыгажэнні: што важна ведаць?



**Ёлачныя цацкі павінны быць не толькі прыгожымі і адпавядаць агульнаму стылю вашага жылля, але і бяспечнымі, якаснымі, даўгавечнымі. Таму не варта іх купляць у сумнеўных месцах, на вуліцы ці ў прыватных асоб. Аддайце перавагу профільным магазінам, дзе вам змогуць прад'явіць санітарна-эпідэміялагічнае пасведчанне і дзе можна будзе вярнуць цацку, калі тая апынецца няякаснай.**

У апошні час звыклыя шкляныя ёлачныя цацкі паступова выходзяць з моды. У крамах з'яўляюцца таннейшыя і больш зручныя ўпрыгажэнні з сінтэтычных палімерных матэрыялаў. Іх выкарыстоўваюць для ўпрыгажэння елак і сувеніраў.

— Выкананыя з няякаснай сыравіны, яны могуць вылучаць у паветра памяшкання стырол, фармальдэгід, метанол, ртуць, свінец і іншыя таксічныя рэчывы, — папярэджвае **ўрач-лабарант Мінскага абласнога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Святлана КЛІМУК.** — Таксама шкоду можа прычыніць фарба, якой пакрыта прыгожая і яркая цацка. Хімічныя рэчывы, якія ўваходзяць у склад няякаснага каляровага пакрыцця, з'яўляюцца таксічнымі, могуць патрапіць на рукі, а затым у страўнік, выклікаючы атручванне і алергічныя рэакцыі.

## Як абраць якасныя навагоднія цацкі?

Пры куплі трэба звярнуць увагу на наяўнасць хімічнага паху. Улічвайце, што на марозе пах можа не адчувацца, затое пры награванні ў памяшканні дэкор часта пачынае пахнуць, таму лепш выбіраць ёлачныя ўпрыгажэнні ў спецыялізаваных аддзелах крам, а не на рынку.

Пакрыццё цацкі павінна быць устойлівым: вазьміце ў руку ўпрыгажэнне і трохі патрыце: калі на руцэ засталася фарба ці бліскаўкі, значыць, тавар няякасны. Калі на цаццы прысутнічаюць разнастайныя стразы, пацеркі і іншыя дробныя дэталі, праверце надзейнасць мацавання дэкору.

На якасных цацках не павінна быць вострых бакоў ці драпаючых задзірын, а мацаванні і зацiскі павінны быць трывалымі.

Пажадана выбіраць менш яркія цацкі з натуральных матэрыялаў — тканіны, дрэва, шкла.

Вядома, для дома лепш аддаць перавагу ёлачным цацкам айчынных ці еўрапейскіх вытворцаў. Кітайскія цацкі часцей аказваюцца небяспечнымі, паколькі там менш жорсткія патрабаванні да спажывецкіх тавараў. Пры куплі ёлачных упрыгажэнняў звяртайце ўвагу на наяўнасць этыкетак і дакумента, якія сведчаць аб бяспецы.



МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
27 снежня 2023 г. № 47 (733)
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

# ГОДНА СУСТРЭЦЬ ГАСЦЕЙ

## Віцебшчына рыхтуецца прыняць XI Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі

**Якія пляцоўкі разгорнуцца на XI Форуме рэгіёнаў Беларусі і Расіі, які традыцыйна праводзіцца пад эгідай Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі і Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расіі і адбудзецца ў Віцебскай вобласці ў 2024 годзе, абмеркавалі ў Полацку ўдзельнікі нарады пад кіраўніцтвам Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі КАЧАНАВАЙ.**



Фота БелТА.





У якасці асноўных пляцовак для арганізацыі секцый, выставак і прыёму гасцей вызначаны Віцебск, Полацк, таксама разглядаюцца некаторыя ўстановы і прадпрыемствы ў Наваполацку, у прыватнасці Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ефрасінні Полацкай і ААТ «Нафтан». Такі фармат правядзення будзе выкарыстоўвацца ўпершыню, да гэтага два дні Форуму праходзілі ў адным горадзе. Усю праграму мерапрыемства, дату яго правядзення будуць абмяркоўваць на пасяджэнні аргкамітэта, у які ўвойдуць прадстаўнікі Савета Рэспублікі і Савета Федэрацыі.

### Усе аб'екты — да 10 чэрвеня

Адной з пляцовак у старажытным Полацку стане былы Дом афіцэраў, дзе сёння ідуць рамонтныя работы і мадэрнізацыя аб'екта. Ён размяшчаецца ў цэнтральнай частцы горада побач з райвыканкамам. Гэта адзіны будынак 1930—1940-х гадоў, які захаваўся. У яго архітэктуры найбольш поўна адлюстравана стылістыка сталінскага перыяду. Ён быў здадзены ў эксплуатацыю ў 1940 годзе і тады называўся Домам Чырвонай Арміі. У час Вялікай Айчыннай вайны тут размяшчаліся нямецкая воінская часць, шпіталь, а ў момант вызвалення горада ад акупантаў будынак быў на 70 % разбураны, унутраную частку амаль поўнасцю знішчыў пажар. Аднавілі яго ў 1947 годзе, і ў той жа час змянілася яго назва — Дом афіцэраў.

Доўгія гады тут праходзілі значныя для Полацка мерапрыемствы, будынак знаходзіўся ў распараджэнні розных устаноў і арганізацый, і ў 2021 годзе былы Дом афіцэраў перадалі Полацкаму дзяржаўнаму ўніверсітэту імя Ефрасінні Полацкай (ПДУ).

Наталля Качанава агледзела аб'ект, ацаніла ход работ. Рэктар ПДУ Юрый Рамаоўскі расказаў Старшыні Савета Рэспублікі, як павінен па праекце выглядаць будынак, якія памяшканні і залы будуць размяшчацца ўнутры. «Трэба аформіць фасад у адзінай каляровай гаме з навакольнымі будынкамі, Полацк прыгожы сваёй камернасцю, гэта трэба ўлічваць», — падкрэсліла спікер.

Да 10 чэрвеня 2024 года ўсе аб'екты, якія будуць задзейнічаны ў XI Форуме рэгіёнаў Беларусі і Расіі, павінны быць гатовы — такую задачу паставіла перад кіраўніцтвам Віцебскай вобласці Старшыня Савета Рэспублікі.

### Прадумаць усё да дробязяў

З удзельнікамі нарады ў Полацку Наталля Качанава абмеркавала, якія секцыі і дзе будуць арганізаваны. Ім будзе прысвечаны першы дзень Форуму. Тры секцыі плануецца арганізаваць у Віцебску і шэсць — у Полацку і Наваполацку. Прамысловасць, адукацыя, ахова здароўя, гандаль, інавацыйны сектар, культурна-гістарычная спадчына, турызм — усё гэта неабходна паказаць гасцям маштабнага мерапрыемства. Для гэтага на нараду былі запрошаны кіраўнікі міністэрстваў адукацыі, культуры, транспарту і камунікацый, старшыні аблвыканкама, гарвыканкамаў, кіраўнікі буйных прадпрыемстваў. Наталля Качанава нацэліла міністраў, кіраўніцтва вобласці, гарадоў на актыўную работу ў падрыхтоўцы аб'ектаў, бо часу застаецца не так многа. «Аб'ём работы вялікі, нельга губляць ні дня», — акцэнтавала ўвагу спікер.

Старшыня Савета Рэспублікі падкрэсліла, што неабходна прадумаць усё да дробязяў — ад лагістыкі і трансферу паміж гарадамі, дзе пройдзе Форум, да сувенірнай прадукцыі для гасцей і ўдзельнікаў мерапрыемства. Як дабрацца, дзе размясціцца, куды схадзіць пасля работы секцый і як пазнаёміцца з прыгажосцю віцебскага краю — кожны нюанс трэба прапрацаваць і зрабіць так, каб удзельнікі і госці адчувалі сябе камфортна.

Старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр Субоцін расказаў, што з абласнога бюджэту на падрыхтоўку да маючага адбыцца Форуму ўжо выдзелена 100 млн рублёў.

*(Заканчэнне на 8-й стар.)*

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

## Шчырая размова па актуальных пытаннях



### Наталля КАЧАНАВА сустрэлася з членамі пярвічнай арганізацыі БСЖ ААТ «Нафтан»

**Напачатку спікер верхняй палаты парламента абазначыла фармат размовы, якая адбылася ў Савеце Рэспублікі, — нефармальная сустрэча. Наталля Качанава рэгулярна наведвае прадпрыемствы, а таму абмеркаваць з супрацоўнікамі калектыву надзённыя пытанні мае магчымасць. Падчас апошняга візіту на ААТ «Нафтан» яна запрасіла прадстаўніц жаночай арганізацыі наведаць Савет Рэспублікі, каб яны бліжэй азнаёміліся з месцам, дзе прымаюцца законы. Перад экскурсіяй адбыўся дыялог спікера і супрацоўніц прадпрыемства.**

Наталля Качанава расказала аб заканадаўчай дзейнасці сенатараў. У прыватнасці, аб рабоце над прывядзеннем заканадаўства ў адпаведнасць з абноўленай Канстытуцыяй. Карэкціроўкі патрабавалі сто заканадаўчых актаў. Гэтая работа, па словах спікера, ужо практычна завершана.

«Тыя законы, над якімі мы працуем, датычацца абсалютна ўсіх сфер дзейнасці: Закон «Аб ахове здароўя», Кодэкс аб адукацыі, Кодэкс аб культуры, — удакладніла Старшыня Савета Рэспублікі. — На апошнім пасяджэнні сесіі ў гэтым годзе мы прынялі Закон «Аб інвестыцыях». Я вельмі рада таму, што, нарэшце, на папярэднім пасяджэнні мы яшчэ разгледзелі пытанні, якія датычацца Крымінальна-працэсуальнага, Крымінальнага кодэксаў, дзе казалі аб адказнасці за педафілію».

Спікер верхняй палаты парламента падкрэсліла важнасць таго, што сенатары прадстаўляюць рэгіёны. «Нам важна, каб законы, якія мы прымаем, былі ад зямлі, каб яны былі зразумелыя і патрэбныя людзям, былі актуальныя», — звярнула ўвагу яна.

Акрамя таго, Наталля Качанава расказала аб дзейнасці экспертнага і экспертна-кансультатыўнага саветаў, савета па пытаннях сацыяльнай адаптацыі і інтэграцыі дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, створаных пры верхняй палаце парламента. Спікер адзначыла, што тэмы для разгляду падказваюць звычайныя людзі, якія звяртаюцца з канкрэтнай праблемай падчас прыёмаў грамадзян. Асаблівую ўвагу Старшыня Савета Рэспублікі засяродзіла на міжнароднай дзейнасці.

«Увогуле, работа вельмі цікавая, але няпростая, — паведаміла яна. — Шмат пытанняў, якія хочацца ахапіць. Многае хочацца зрабіць. Прэзідэнт нам заўсёды кажа, што самае галоўнае ў палітыцы, якую мы праводзім у краіне, — гэта чалавек, справядлівыя адносіны да яго. Запыт на справядлівасць цяпер — самая актуальная тэма. І ўсе рашэнні, якія прымаюцца, павінны быць на карысць дзяржавы».

Вялікую работу сенатары праводзяць з людзьмі. Наталля Качанава заўважыла, што сёлета ў Савет Рэспублікі паступіла каля шасці тысяч зваротаў. Гэта калі не ўлічваць пытанні, агучаныя людзьмі падчас сустрэч на прадпрыемствах і арганізацыях. Спікер закранула тэму дзейнасці грамадскіх арганізацый. Па словах Наталлі Качанавай, людзі павінны туды ўступаць па клічы сэрца. «Атрымаецца тады, калі людзі бачаць, што разам аб'ядналіся і робяць добрыя справы, — дадала яна. — Мы разам усё можам. Але ў грамадскім жыцці гэта павінна быць нефармальна».

Падчас сустрэчы таксама былі абмеркаваны пытанні развіцця рэгіёнаў, падтрымкі моладзі, каб яна не з'язджала ў сталіцу, а прыносіла карысць краіне ў малых гарадах. Па словах спікера, усё для гэтага створана.

У размове з журналістамі Наталля Качанава адзначыла, што такую сустрэчу, якая адбылася ў Савеце Рэспублікі, нельга ні недааценіць, ні перааценіць. «Сустракацца з людзьмі заўсёды цікава, — падкрэсліла спікер. — Для нас гэта важна, бо так мы даведваемся, якія праблемы ўзнікаюць у нашых людзей. Але нам важна і давесці тую інфармацыю, якой мы валодаем, да працоўнага калектыву, да тых, з кім ты сустракаешся».

**Вераніка КАНЮТА.**

# ГОДНА СУСТРЭЦЬ ГАСЦЕЙ

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

У абласным цэнтры абновяць шэсць буйных аб'ектаў, у ліку якіх Канцэртная зала «Віцебск», плошчы Перамогі і Свабоды, Летні амфітэатр, гасцініца. У Полацку рамонт і рэканструкцыя будуць праводзіцца на буйных помніках і мемарыялах, у жылфондзе. Таксама будуць праводзіцца дарожна-рамонтныя работы на трасах і вулічнай сетцы гарадоў. У тым ліку мясцовыя ўлады ў Віцебску, Полацку і Наваполацку зоймуцца добраўпарадкаваннем дваровых тэрыторый.

Гасцей будуць прымаць не толькі гасцініцы ў абазначаных гарадах, але і ў прылеглых раёнах, задзейнічаюць базы адпачынку, школьныя лагеры. Да паслуг удзельнікаў Форуму рэгіёнаў і мясцовых жыхароў будуць адкрыты аб'екты грамадскага харчавання — як стацыянарныя, так і перасоўныя.

Намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Анжаліка Нікіціна прапанавала запрасіць дэлегацыі кітайскіх гарадоў-пабрацімаў, якія, акрамя знаёмства са славутасцямі гарадоў паўночнага рэгіёна, хацелі б стаць удзельнікамі Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі. Таксама яна адзначыла, што на базе нафтаперапрацоўчага завода можна было б арганізаваць выставу прадукцыі прадпрыемстваў галіновага кластара, і Наталля Качанава падтрымала гэту ідэю.

Старшыня Савета Рэспублікі адзначыла, што важна стварыць станоўчы імідж будучага Форуму рэгіёнаў і інфарміраваць насельніцтва аб значным маштабным мерапрыемстве. Для гэтага яна прапанавала задзейнічаць брэндаваныя аўтобусы, вулічныя экраны, на якіх будзе трансліравацца інфармацыя аб Форуме рэгіёнаў Беларусі і Расіі, выкарыстоўваць нацыянальную сімволіку ў вулічных арт-аб'ектах — у кожным горадзе трэба прадугледзець такія моманты.

### Часу застаецца мала

Па выніках нарады Наталля Качанава расказала журналістам, што па прапанове кіраўніцтва Віцебскага аблвыканкама быў выбраны менавіта паўночны рэгіён, каб паказаць нашу гісторыю, карані беларускай дзяржаўнасці. «Упершыню мы будзем праводзіць Форум рэгіёнаў у двух гарадах Віцебскай вобласці: у Полацку ў першы дзень будуць працаваць секцыі, а на другі дзень пленарнае пасяджэнне і частка секцый будуць праходзіць у Віцебску», — адзначыла спікер.

Наталля Качанава дадала, што падрыхтоўчай работы яшчэ шмат. «Часу застаецца мала, таму што ў нас важнае палітычнае мерапрыемства — электаральная кампанія. Але разам з тым мы паралельна рыхтуемся да важнага мерапрыемства, якое праводзіцца пад эгідай Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і Савета Федэрацыі Расійскай Федэрацыі, — Форуму рэгіёнаў. Яны добра сябе зарэкамендавалі — такія важныя мерапрыемствы, якія праходзяць штогод. У мінулым годзе юбілейны Форум рэгіёнаў прайшоў у горадзе Уфе, а ў нас наперадзе вялікая работа па напаўненні, бо важна выбраць тэматыку. Цяпер ужо ў поўнай меры ідзе падрыхтоўка па кантрактах, пагадненнях, якія будуць падпісаны ў рамках гэтага мерапрыемства, таму што гэта заўсёды асноватворнае», — расказала Старшыня Савета Рэспублікі.

Паводле слоў спікера, ідзе работа па падрыхтоўцы выступленняў, якія прагучаць на Форуме рэгіёнаў, па фармуляванні актуальных тэм, якія неабходна разгледзець на мерапрыемстве, а мясцовыя органы ўлады павінны зрабіць усё, каб нашы гарады выглядалі годна. «Робіцца ўсё, каб паказаць у поўным аб'ёме гістарычныя аб'екты, якія ёсць у Полацку, і горад Полацк як аснову нашай духоўнасці, меку нашай дзяржаўнасці, адкуль пачыналася гісторыя нашай краіны, дзе ёсць вялізная колькасць музеяў, гістарычных каштоўнасцяў, якія павінны ўбачыць госці, калі прыедуць да нас, і тыя, хто будзе ўдзельнічаць у Форуме рэгіёнаў Беларусі і Расіі», — падсумавала Наталля Качанава.

**Паводле БелТА.**

❍ Дарэчы

### Наперадзе шмат працы

Пасля нарады ў Полацку Наталля Качанава ў размове з журналістамі закранула і дзейнасць Савета Рэспублікі. Спікер расказала аб выніках пасяджэння 11-й сесіі сёмага склікання, на якім разгледзелі важныя пытанні. «Вы ведаеце, што ў развіццё Канстытуцыі мы павінны былі разгледзець каля ста законапраектаў. Я скажу, што гэта работа практычна завершана. Мы разгледзелі важныя законапраекты, якія датычацца дзяржаўных закупак, інвестыцый, крымінальнай адказнасці (гэта Крымінальны кодэкс, мы ўнеслі туды дапаўненні і змяненні, іх падтрымалі члены Савета Рэспублікі), закон аб Прэзідэнце нашай краіны», — адзначыла Наталля Качанава, дадаўшы, што сенатары выканалі адказную работу, таму што яны разглядалі гэтыя законапраекты не толькі на фінальнай стадыі, але і падключаліся да гэтых тэм даўно, абмяркоўваючы іх на экспертных і экспертна-кансультатыўных саветах.

Таксама, гаворачы аб задачах, якія стаяць перад сенатарамі на парадку дня, Наталля Качанава адзначыла, што іх нямала, рэалізоўвацца яны будуць без сыходу на канікулярны час. «Мы вельмі актыўна працуем з людзьмі, праводзім прыёмы па асабістых пытаннях, прамыя тэлефонныя лініі, сустрэчы ў калектывах, што вельмі важна. І гэта работа толькі набірае тэмп, ніколькі яе не змяншаем, паколькі бачым, што ёсць вынікі. Не проста даводзім інфармацыю, з якой мы прыходзім у калектывы або арганізацыі і тады, калі праводзім прыёмы па асабістых пытаннях, а мы робім аналіз зваротаў, якія паступаюць да нас у ходзе такіх сустрэч, і ў далейшым гэта выкарыстоўваем для сваёй работы», — падзялілася Старшыня Савета Рэспублікі.

# ДОБРЫЯ ВЕСТКІ, ДОБРЫЯ СПРАВЫ

**У гэты чароўны перадпавагодні час хочацца згадваць добрыя справы, якімі ўдалося парадаваць сябе і іншых, успамінаць самае лепшае, што здарылася апошнім часам у жыцці. Мы прапанавалі зрабіць гэта прадстаўнікам мясцовага самакіравання ў розных кутках нашай краіны. І не прагадалі: добрых спраў было нямала, а ў планах — яшчэ больш.**

## НАША ВЯСКОВАЯ ЛЕКАРКА

### Актывісты з аграгарадка Гарадзішча Шклоўскага раёна разам з мясцовай гаспадаркай аднавілі святую крыніцу

**Гісторыя гэта пачалася 11 гадоў таму, калі жыхары аграгарадка Гарадзішча ўспомнілі пра прыродны калодзеж каля ракі Бася, з якога іх продкі бралі ваду, і вырашылі яго аднавіць. Асноўныя выдаткі па добрай справе ўзяла на сябе мясцовая аграгаспадарка ААТ «Новагарадзішчанскае», а месцічы паўдзельнічалі ўдарнай працай — высякалі хмызы, садзілі дрэвы, акультурвалі тэрыторыю. Мясцовы прадпрымальнік за свой кошт зрабіў і ўстанавіў крыж. З тых часоў крыніца з'яўляецца галоўным месцам прыкладання сіл тутэйшых жыхароў, і яе добраўпарадкаванне працягваецца па сённяшні дзень.**



Таццяна Крупенька — прадстаўніца мясцовага самакіравання — адна з тых, хто стаяў каля вытокаў гэтай прыгожай гісторыі. На той час яна працавала намеснікам дырэктара па ідэалогіі ААТ «Новагарадзішчанскае». Напэўна, думка пра адраджэнне крыніцы ўжо лунала ў паветры, бо, калі прагучала ўслых, усе дружна яе падтрымалі. Любая задума, калі яе робяць усім светам, заўсёды атрымліваецца. У тым, што крынічка сёння адноўленая, заслуга ўсіх жыхароў аграгарадка. Без жадання і непасрэднага ўдзелу кожнага нічога б не атрымалася.

— Крыж вырабіў Рыгор Шындзікаў, мастак-самавук Мікалай Сімчанка прыгожа аформіў крынічку, мясцовы жыхар Аляксандр Фомчанка зрабіў драўляны зруб, Ала Эліна клапоціцца, каб штогод быў арганізаваны малебен і асвятленне крыніцы, — пералічвае Таццяна Канстанцінаўна.

Днём нараджэння крыніцы лічыцца 1 кастрычніка. Менавіта ў гэты дзень яна была асвечана ў 2014 годзе ў гонар іконы Божай Маці «Лекарка». З тых часоў водны аб'ект пад надзейным наглядам жыхароў, якія і кветачкі высаджваюць, і смецце прыбіраюць, і за чысцінёй калодзежа глядзяць. Цэлая каманда шэфствуе. Сярод тых, хто прымае актыўны ўдзел, Уладзімір Громаў, сужэнцы Таццяна і Валянцін Шастаковы, Валянціна Самусенка і іншыя.

Калодзежу далі новае жыццё, а Таццяна Крупенька, натхнёная падтрымкай землякоў, напісала праект і паслала на конкурс Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Цэнтральны навукова-даследчы інстытут комплекснага выкарыстання водных рэсурсаў якраз у перыяд з 2017 па 2020 год праводзіў інвентарызацыю паверхневых водных аб'ектаў у разрэзе рачных басейнаў тэрытарыяльна-адміністрацыйных адзінак. У сувязі з гэтым і быў аб'яўлены конкурс «Раскажы аб сваёй крыніцы».



# АДНАЎЛЯЕМ «ДЗЕДАЎСКІЯ» ВЁСКІ

## Населеныя пункты Гожскага сельсавета прырастаюць новымі сядзібамі

**Апошнім часам на тэрыторыі сельскага Савета, які знаходзіцца ў Гродзенскім раёне, пачало актыўна развівацца індывідуальнае будаўніцтва. Тым, хто жадае пабудавацца ў сельскай мясцовасці, улады прадастаўляюць зямельныя ўчасткі. Такім чынам, вёска не толькі працягвае сваё жыццё, але і набывае новыя, сучасныя рысы.**
**У сельвыканкаме звяртаюць увагу на паляпшэнне дэмаграфічнай сітуацыі. Колькасць жыхароў расце, і нават ёсць неабходнасць у пашырэнні сярэдняй школы ў аграгарадку Гожа.**



**Старшыня сельвыканкама і сельскага Савета дэпутатаў Наталля МАКАЎЧЫК** прыводзіць такую лічбу. Калі на пачатак гэтага года на тэрыторыі сельсавета пражывалі 2 809 чалавек, цяпер колькасць жыхароў дасягае 3 тысяч. Расце і колькасць дзіцячага насельніцтва. Напрыклад, у Гожскай сярэдняй школе зараз займаецца 370 вучняў, заняткі праходзяць у дзве змены, таму мяркуюць заняцца пашырэннем школьнага корпуса.

— Такі дадатны дэмаграфічны ўсплеск невыпадковы. Ён абумоўлены актыўным будаўніцтвам, якое цяпер вядзецца на тэрыторыі сельскага Савета. А штуршком да гэтага стала даручэнне Прэзідэнта падчас наведвання Гродзенскай вобласці ў 2018 годзе. Тады Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу Гродзенскага аблвыканкама на неабходнасць аднаўлення «дзедаўскіх» вёсак у Гродзенскай вобласці. Магу сказаць, што мы ў адпаведнасці з гэтым даручэннем фарміруем жыллёвую забудову нашых населеных пунктаў, вёскі становяцца больш кампактнымі, шчыльнымі, праводзяцца камунікацыі, — расказала суразмоўніца.





На тэрыторыі сельскага Савета 29 населеных пунктаў. Наталля Макаўчык звяртае ўвагу, што вёскі ў іх не знікаюць, наадварот, ёсць тэндэнцыя да росту насельніцтва. Гэта становіцца магчымым за кошт распрацоўкі новых участкаў альбо новых забудоў на месцы старых знесеных дамоў. Участкі прадастаўляюцца як у парадку чаргі, так і прадаюцца з аўкцыёна. Такім чынам, адбылося пашырэнне населеных пунктаў Барбарычы, Цыдовічы, распрацавана схема развіцця населенага пункта Польніца, дзе прадугледжана выдзяленне 160 участкаў. Іх асваенне будзе весціся ў некалькі этапаў.

Па словах старшыні сельвыканкама, на ўчасткі цяпер даволі высокі попыт. Але такая сітуацыя была не заўсёды. Яшчэ не так даўно назіраўся вельмі значны адток насельніцтва ў абласны цэнтр. Зараз ідзе зваротны працэс.

Асабліва гэта датычыцца населеных пунктаў, якія знаходзяцца не вельмі далёка ад Гродна. Гэта тэрыторыя асвойваецца найбольш хуткімі тэмпамі. І сёлетні год асабліва паказальны. Насельніцтва актывізавалася менавіта ў плане будаўніцтва індывідуальных жылых дамоў.

Ход забудовы знаходзіцца пад кантролем мясцовай адміністрацыі. Як падкрэсліла старшыня сельвыканкама, асаблівая ўвага надаецца тэрмінам будаўніцтва, парадку асваення зямельных участкаў. У сельскім Савеце ведаюць, як і ў якой стадыі вядзецца будаўніцтва дамоў. Дзякуючы гэтаму тут амаль пазбеглі даўгабудаў. Ды і самі забудоўшчыкі імкнуцца своечасова асвоіць участак з перспектыўнай інжынернай і транспартнай інфраструктурай, маляўнічым ландшафтным наваколлем.

— У нас даволі прыгожыя мясціны — лес, возера, побач Нёман. І наша геаграфічнае становішча таксама зручнае — да абласнога цэнтра ад аграгарадка Гожа ўсяго 15 хвілін язды, да таго ж і транспартнае злучэнне добра развіта. Інфраструктура населенага пункта таксама на сучасным узроўні. Да нас едуць гараджане, у тым ліку маладыя сем'і, што сведчыць аб тым, што вёска будзе жыць. Сюды ахвотна ідуць працаваць прадпрыемальнікі, — працягвае пералічваць плюсы старшыня сельвыканкама.

Наталля Макаўчык зазначыла, што значны імпульс развіццю «дзедаўскіх» вёсак надаюць менавіта працоўныя месцы. На гэты аспект таксама была звернута ўвага кіраўніка дзяржавы. Вёскі не могуць развівацца без вытворчай базы. Гожскаму сельсавету ў гэтым сэнсе пашанцавала — тэрыторыя ўключана ў склад свабоднай эканамічнай зоны, дзе працуюць дзясяткі паспяховых прадпрыемстваў. Таму недахопу ў працоўных месцах няма. Добрыя стасункі наладжаны як з мясцовым сельгаспрадпрыемствам, так і з прыватнымі суб'ектамі гаспадарання. Значную дапамогу ў правядзенні патрыятычных акцый і мерапрыемстваў аказвае 6-я механізаваная брыгада Гродзенскага гарнізона.

Значным сумесным праектам сельвыканкама і мясцовых прадпрыемстваў тут называюць дзіцячую пляцоўку ў аграгарадку Гожа. Мясцовыя жыхары не аднойчы ўздымалі гэта пытанне перад уладамі. Маўляў, і месца для яе ёсць у самым цэнтры аграгарадка, побач са школай.

Рухавіком для ажыццяўлення праекта стаў конкурс грамадзянскіх ініцыятыў, у выніку якога з'явіўся невялікі стартавы капітал. У работу ўключыліся і мясцовыя жыхары. Завершыць праект дапамаглі спонсары — кампанія «Біяком тэхналогія» і сельгаскааператыў «Гожа». Сёлета пляцоўка — адно з самых масавых дзіцячых аб'ектаў аграгарадка. Як зазначыла старшыня сельвыканкама, у планах правесці добраўпарадкаванне тэрыторыі дзіцячага садка і набярэжнай Нёмана ў межах аграгарадка. Паступаюць прапановы і ад жыхароў іншых населеных пунктаў сельсавета.

Сёлета асноўны акцэнт зроблены на добраўпарадкаванні вёскі Новая Гожа. За кошт раённага бюджэту праведзены капітальны рамонт дамоў, на сродкі сельскага Савета добраўпарадкаваны прыдамавыя тэрыторыі. Летась у вёсцы здадзены ў эксплуатацыю 56-кватэрны дом, амаль палова кватэр выдзелена шматдзетным сем'ям. Нядаўна жыхары Новай Гожы выйшлі з ініцыятывай абсталяваць спартыўную пляцоўку.

— Радуе, што насельніцтва прыходзіць не толькі з просьбамі і праблемамі, але і з уласнымі ініцыятывамі аб правядзенні масавых мерапрыемстваў, спартакіяд. Мы стараемся іх увасобіць у жыццё, як гэта адбылося з дзіцячай пляцоўкай, якую мы назвалі «Дворык дзяцінства». Канешне, яшчэ нямала трэба зрабіць, удасканаліць, думаю, што ўсё атрымаецца, — перакanана субяседніца.

З ідэяй абсталявання спартыўнай пляцоўкі сельскі Савет сумесна з жыхарамі рыхтуе праект для ўдзелу ў абласным конкурсе грамадзянскіх ініцыятыў, які ўжо аб'яўлены на будучы год.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
**Фота grodnonews.by**

### ❍ У тэму

**Алена ПАСЮТА, старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў:**

— У мінулым годзе на рэалізацыю грамадзянскіх ініцыятыў было затрачана каля 300 тысяч рублёў. Сёлета ў абласны Савет паступіла больш за паўсотні заявак. Іх рэалізацыя вядзецца ў адпаведнасці з Праграмай сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2021—2025 гады. Дзякуючы змяненням, якія сёлета ўнесены ў Закон аб мясцовым кіраванні і самакіраванні, паўнамоцтвы абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў па каардынацыі гэтай работы пашыраны. А мясцовы бюджэт фарміруецца з улікам грамадзянскіх ініцыятыў, рэалізацыя якіх будзе мець абавязковы характар.



— Мы ахвотна падключыліся да гэтых даследаванняў, падрабязна апісалі гісторыю крынічкі і яе аднаўлення, — расказвае актывістка. — Наша крынічка наогул унікальная, прыродай створаная. Як жывая, пульсуе на беразе ракі Басі. Месца маляўнічае, мае магічную прыцягальную моц. Вялікім попытам крыніца карысталася раней, у дарэвалюцыйны, а потым і савецкі час, пакуль былі праблемы з водаправоднай вадой. Калі з'явіліся калонкі, пра крынічку паціху сталі забываць. Месца багністае, пакрысе зарасло кустоўем і стала маладаступным. Калі пачалі крынічку аднаўляць, высветлілася, што калодзеж рабіўся грунтоўна. Там два жалезабетонныя кольцы стаялі.

Усяго ў конкурсе ўдзельнічала 60 праектаў з усёй Беларусі. І даследаванне ад жыхароў аграгарадка ўвайшло ў дзясятку наймацнейшых. А праз паўгода па пошце прыйшоў падарунак — кніга «Крыніцы Беларусі», дзе было апісанне і гарадзішчанскай крынічкі. Гэтую кнігу жыхары перадалі ў мясцовую бібліятэку, каб усе ведалі і берaглі мясцовую славутасць. Акрамя гэтага, яны зрабілі яшчэ і самаробную кнігу пра гісторыю крынічкі. Гэта праца таксама захоўваецца ў бібліятэцы. Там апісаны таксама працэс яе аднаўлення і прыкладаецца шмат фота.

У 2019 годзе гаспадарка ўзялася зрабіць зону паломніцтва больш камфортнай. Былі пабудаваны драўляная купель, альтанка для адпачынку, заменены зруб.

Сёлета аграгаспадарка зноў вяла работы на важным у духоўным плане аб'екце аграгарадка. Каб крынічку не падтапляла, была зроблена рэканструкцыя. Зноў абноўлены калодзеж, пакладзены дрэнаж, пачышчаны бераг і дарожкі, зроблены дадатковыя падыходы да крынічкі. Да справы далучыўся адзін з пастаянных спонсараў грамадскіх ініцыятыў, ураджэнец Шклова Сяргей Харланцьеў.

**Старшыня Гарадзішчанскага сельсавета Алена ШАБУНЁВА** адзначае:

— Вядома, самастойна жыхары не змаглі б зрабіць такую маштабную работу, нам пастаянна дапамагае гаспадарка ААТ «Новагарадзішчанскае». Але ініцыятыва сыходзіла ад людзей. Гэта былі дэпутаты яшчэ 26-27-га скліканняў, якія потым сталі старастамі, — Таццяна Крупенька, Уладзімір Громаў, Валянцін Шастакоў — самы галоўны наш касцяк. Пакрышачку да іх прымкнула шмат народу. І цяпер штогод, як толькі сыходзіць снег, яны шчыруюць на гэтай крыніцы. Яна раней знаходзілася на тэрыторыі вёскі Русакі, цяпер гэта вуліца аграгарадка пад назвай Русакоўская. Месца вельмі папулярнае, сюды прыязджаюць і людзі сталага ўзросту, і зусім маладыя.

Наогул, з дапамогай аграгаспадаркі было зроблена шмат чаго. У той час, калі яе кіраўніком быў Трафім Галіца, пабудаваны Дом культуры, дзіцячы садок, уся інфраструктура. Усё для людзей. Сённяшні кіраўнік аграгаспадаркі Анатоль Балабосаў таксама дэпутат і актыўны наш памочнік у рэалізацыі грамадскіх ініцыятыў. Сёлета ў Год міру і стваральнай працы мы працягвалі падтрымліваць усё тое, што калісьці пачыналася, удасканальваць і паляпшаць. І людзі з энтузіязмам ва ўсім гэтым удзельнічаюць.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота з архіва Таццяны КРУПЕНЬКІ.**

# РАСКВЕЦІЦЬ ВЁСКІ — І ЖЫЦЦЁ

**Адным з кірункаў дзейнасці Шайцераўскага сельскага Савета Верхнядзвінскага раёна з'яўляецца добраўпарадкаванне населеных пунктаў. Яго старшыня Таццяна РАЗУМНАЯ ўпэўнена, што спадзявацца трэба толькі на свае сілы, калі хочацца жыць у прыгажосці. Таму разам з неабыякавымі вяскоўцамі старшыня на працягу цэлага года стварае архітэктурныя формы, разбівае кветнікі і даглядае воінскія пахаванні.**



У склад Шайцераўскага сельсавета ўваходзяць 14 вёсак, а гэта каля 1200 жыхароў. Старшыня тлумачыць, што добраўпарадкаванне — справа не аднаго дня, таму цэлы год нарыхтоўваюць ідэі і бяруць на заметку тое, што трэба падправіць. У студзені зацвярджаецца агульны план па добраўпарадкаванні населеных пунктаў. Штаб, у які ўваходзяць старэйшыны вёсак і кіраўнікі арганізацый, каардынуе работу, праводзіць маніторынгі зробленага.



Адной з «разынак» сельсавета з'яўляецца яго квяцістасць. Зімой гэтыя стракатыя рэкі пабачыць не атрымаецца, а вось з вясны вока мясцовых жыхароў радуюць пышныя клумбы. Уздоўж шматкватэрных дамоў, дзе пражываюць шматдзетныя і маладыя сем'і, узвышаюцца туі і разбіты вялікія кветнікі. «Дрэўцы разам з дэкаратыўнымі кустарнікамі закупілі некалькі гадоў таму, іх дапамагалі высаджваць тыя, хто шукае працу. Сумясцілі прыемнае з карысным: і прыгажосць навялі, і атрымалі грошы», — каментуе Таццяна Разумная.

Дарэчы, вырошчваннем кветак у сельсавеце займаецца мясцовая школа, а ААТ «Шайцерава» прадастаўляе насенне. І гэта яшчэ адно пацвярджэнне таго, што на агульную справу пад кіраўніцтвам нераўнадушнага дэпутата рупліца талакой ад малога да вялікага. У хуткім часе аграгарадок па колькасці высаджаных раслін дагоніць абласныя цэнтры: амаль штогод тут высаджваюць каля 15 тысяч кветак! Гэта будства фарбаў і пахаў не можа не радаваць не толькі шайцераўцаў, але і турыстаў. Асабліва карыстаецца попытам для фота кветкавы рог, з якога «бягуць» каляровыя рэкі. Старшыня сельсавета тлумачыць, што доўгія гады ўпрыгожвалі плошчы архітэктурнымі формамі з прыродных матэрыялаў, але яны былі недаўгавечныя. А некалькі гадоў таму разам з вяскоўцамі прыдумалі выкарыстоўваць у кампазіцыях бетонныя фігуры — так у населеных пунктах і каля дарогі з'явілася некалькі такіх выяў. Напярэдадні абласных «Дажынак-2018» на ўездзе ў Верхнядзвінск з'явілася 14 новых архітэктурных форм, якія сталі вынікам палёту фантазіі таленавітай мясцовай жыхаркі Тамары Заляціла. Каля школы цяпер узвышаецца аловачніца з бетону, каля ўваходу ў фірменную краму — фігура свінкі, а вёску Цясты ўпрыгожвае карова і цяля, свінка з парасятамі — сімвалы поспеху



і росквіту аднаго з найлепшых сельгаспрадпрыемстваў Віцебшчыны — ААТ «Шайцерава».

Асаблівую ўвагу ў сельсавеце надаюць добраўпарадкаванню помнікаў Вялікай Айчыннай вайны. Так, дзіцячы садок даглядае магілу ахвяр вайны ў вёсцы Ляшчылава, школьнікі ўзялі шэфства над помнікамі ў вёсках Цясты, Жыгулі, Барсукі і ў аграгарадку Шайцерава. Добрым прыкладам па захаванні памяці аб абаронцах Айчыны захапіліся і супрацоўнікі раённага аддзялення Следчага камітэта, яны аказваюць дапамогу па добраўпарадкаванні помніка ў вёсцы Барсукі.

Добраўпарадкаванне тэрыторыі не адзінае, што разам са старшынёй робяць актыўныя жыхары. Усе святы, асабліва абрадавыя, шайцераўцы сустракаюць разам. Купалле, Масленіца, Каляды — па асабістай ініцыятыве арганізацыяй мерапрыемстваў займаецца староста вёскі Цясты Людміла Баярынава. Насельніцтва з радасцю падтрымлівае ініцыятыву, прычым людзі любяць не толькі адпачываць разам, але і працаваць: амаль кожны месяц у сельсавеце праводзяць суботнікі.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**
**Фота «Двинская правда», «Витебские вести».**

# РУЖА НА ПАМЯЦЬ

## Як у сельсавеце ствараюць цікавыя сэлфі-зоны

**Вялікія гарады спаборнічаюць ва ўсталяванні самых разнастайных фотазон, асабліва зараз, у святочныя дні. Пра тое, каб у гараджан і гасцей на памяць засталіся прыгожыя здымкі, клапоцяцца камунальныя службы, гандлёвыя арганізацыі, прадпрыемствы грамадскага харчавання. Гэтыя інсталяцыі часам здзіўляюць не толькі раскошай, але і дасціпнасцю аўтараў, арыгінальнасцю ідэй. Асабліва кранаюць тыя, у якіх адчуваюцца дабро, цеплыня, утульнасць. Усё пералічанае, як вядома, характэрна для гарадоў. А што ў вёсках, пасёлках, аграгарадках?**

